Пролетарии всех стран, соединяйтесь! פּראָלעטאַריער פֿון אַלע לענדער פֿאַראייניקט זיך! Prol etarjusze wszystkich krajów, łączcie się! Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

УМОВЫ ПАДПІСКІ:
на 1 м-ц—90 к.; на 3 м-цы—2 р. 60 к а 6 м-цаў—5 р.; на 1 год—9 р. 75 к.
Змена адрасу: мясцовага—10 к., іншагароднага—20 кап.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ:
За радок нонпарэлі (пасьля тэксту)—50 кап. Для Масквы і Ленінграда—1 р.
Паскарэ тэксту у два разы даражэй.
Пры шматразовым друкаваньні—скідка на згодзе.
Згодна пост. СНК ад 10 верасьня 1924 г. бярэцца зьверх тарыфу 10 проц. падатку.

Падпіска і абвесткі прымаюцца: У Гал. Канторы газ. „Зьвязда"—г. Менск, Савецкая 63, трэці паверх, ад 9 гадз. раніцы да 3-х гадз. дня. У акруговых гарадох—у аддз. Бел. Дзярж. Выдавецтва і ва ўсіх пашт.-тэл. канторах,

РЭДАКЦЫЯ—Г. МЕНСК, САВЕЦКАЯ, 63.

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральн. Камітэту камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі і Мен. АК КП(б)Б.

РЭДАКЦЫЯ І ГАЛОЎН. КАНТОРА.
1) Рэдактар прымае ад 11—1 гадз. дня; тэлефон № 10-74. 2) Сэкратар рэдакцыі—ад 12 да 2-ое гадзіны дня, тэл. № 6-19. 3) Начны рэдактар (друкарня) ад 6 гадз. веч. тэл. № 6-42
Кіраўн. Гал. Канторай, Канторы абвестак і падпіскі } тэл. № 781.

СУБОТА, 7 СТУДЗЕНЯ 1928 г.
№ 6 (2813)
Кошт асобнага нумару ўсюды 5 кап.

Год выданьня дванаццаты.

За максымальнае выкарыстаньне экспартных магчымасьцяй

Усім вядома, што наш СССР можа ўзьніміць сваю гаспадарку і культуру, галоўным чынам, за кошт сваіх унутраных сродкаў і магчымасьцяй.

Адгэтуль—яшчэ агалошаная Леніным палітыка самай суровай эканоміі, максымальнага выкарыстаньня нашых рэсурсаў, зьнішчэньня якіх-бы та ні было зьлішкаў.

Посьпехі гэтай палітыкі мы маем у наяўнасьці. Тэмп нашага гаспадарчага разьвіцьця апераджае тэмпы ўсіх краін, ня выключаючы Амэрыкі, нават у пэрыяды іх найбольшага эканамічнага росквіту.

Але ці можам мы супакоіцца на гэтым тэмпе?

Ці няма ў нас магчымасьцяй яшчэ больш узмацніць гэты тэмп; ці выкарыстаем мы досыць поўна нашы магчымасьці?

На гэта пытаньне прыходзіцца адказаць, што магчымасьцяй для нашага росту ў нас шмат, але што гэтыя магчымасьці выкарыстоўваюцца намі далёка ня поўнасьцю.

За прыкладамі далёка ісьці ня прыходзіцца.

Усім вядома, якое значэньне для нашае краіны мае экспарт.

Заграніца цікавіцца і купляе многія нашы прадукты і тавары.

Вось далёка ня поўны пералік такога роду прадуктаў і тавараў, якія ёсьць у нас, у Беларусі:

Анучы, косьці, рогі, капыты, мяздра і мяздровы клей, пух і пер'я, ягады, арэхі, яблыкі, бульба, гароднiна, грыбы, лекавыя травы, сена, сыр, мёд, рыба, ракі, рыбіная луска, крухмалапрадукты, журавінны экстракт, дрожджы, крэйда, вапна, земляныя фарбы, кварцавы пясок, гліна, шкляныя вырабы, драўняны вугаль, саматужныя вырабы і г. д., і г. д.

Ці можна сказаць, што мы ўсё зрабілі для таго, каб магчыма больш сабраць гэтых прадуктаў і прадаць за граніцу?

Мы робім у гэтых адносінах вельмі мала ў параўнаньні з тым, што мы маглі-б зрабіць.

Вываз з БССР гэтых прадуктаў за граніцу—нязначны.

Выключэньне складаюць грыбы. У першым квартале бягучага гаспадарчага году мы тут, у Беларусі, крыху падцягнуліся з загатоўкаю экспартных грыбоў і вывезьлі іх на круглую суму у **паўмільёна рублёў**.

Але, зразумела, і па грыбох мы ня вычарпалі ўсіх магчымасьцяй.

Гэты прыклад мы падалі толькі для таго, каб паказаць, наколькі буйнос значэньне могуць мець для нашае народнае гаспадаркі нават такія дапаможныя артыкулы экспарту.

Але і тое, што мы загатаўляем для экспарту, мы яшчэ не навучыліся, як трэба, захоўваць, упакоўваць і інш. Сыраза, здавалася-б, не цяжкая, а між тым, на дэфектах захаваньня экспартных прадуктаў, іх упакоўкі і інш. мы маем страты, і не малыя, у дапе на нашы вывазныя тавары.

Само сабою зразумела, што поўнае выкарыстаньне экспартных магчымасьцяй безадкладна і самым спрыяючым чынам адбілася-б на прамысловасьці, якая абслугоўвае экспарт.

Для нашай БССР, з яе аграрным пераважаньнем, гэта мела-б вялікае значэньне. Да пытаньняў экспарту, да пытаньняў найбольш інтэнсыўнага выкарыстаньня ўсіх экспартных магчымасьцяй павінна быць прыкавана сур'ёзная ўвага гаспадарчых арганізацый, асабліва ніжэйшай каапэрацыйнай сеткі, якая мае блізкае дачыненьне в сялянствам.

Партыйныя арганізацыі КП(б)Б таксама павінны зьвярнуць на гэта пытаньне сваю ўвагу, памятуючы, што гаспадарчыя праблемы па-ранейшым застаюцца «ў цэнтры ўвагі ўсяе КП(б)Б».

Задачы экспарту ва ўмовах Беларусі заслугоўваюць гэтае ўвагі.

Пасьпяховае выпаўненьне іх здолее шпарчэй пасунуць далей наперад наша гаспадарчае разьвіцьцё.

Беларускія грыбы на амэрыканскім рынку.

БАБРУЙСК. Атрыманы весткі, што сухія грыбы, загатоўленыя ў Бабруйшчыне, маюць вялікі попыт на амэрыканскім рынку. Акрэлаз накіраваў у Амэрыку на 77.000 р. грыбоў.

ГРАНДЫЁЗНЫЯ ДЭМАНСТРАЦЫІ Ў ІНДЫІ.

Сустрэча афганскага падышаха абярнулася ў 500.000-ую супроцьангельскую дэманстрацыю.

ІНДУСЫ СКАРДЗЯЦЦА НА ЗЬДЗЕКІ АНГЕЛЬСКАЙ ПАЛІЦЫІ.

КАБУЛ, 4. На падставе індыйскага нацыянальнага друку можна заключыць, што прабываньне падышаха Аўганістану ў Індыі абярнулася ў грандыёзную нацыянальную дэманстрацыю.

Па шляху сьледаваньня падышаха яго сустракалі прадстаўнікі розных мусульманскіх і індускіх грамадзкіх арганізацый з усіх канцоў краіны.

Мітынг у Бамбэі набыў характар маніфэстацыі за незалежнасьць Індыі. Энтузіязму падняволенага народу, які ўпяршыню пасьля многіх гадоў вітаў кіраўніка свабоднай ад чужаземнага панаваньня краіны, ня было канца.

Прамовы падышаха аб роўнасьці, верацярпімасьці і брацтве абудзілі нацыянальныя імпульсы і імкненьне да больш цеснага зблiжэньня з афганскім народам, які вызваліўся і стаў на шлях самастойнага разьвіцьця. Гэтыя настроі адбіліся ў шматлікіх адрасох ад розных палітычных і грамадзкіх арганізацый і запаўненьнях у дружбе зьмешчаных у друку.

Урачыстую афіцыяльную сустрэчу зацямніла сустрэча, наладжаная падышаху насельніцтвам, адзначыўшая блізкасьць двух сваіцкіх народаў, аб'яднаных агульнымі звычаямі і імкненьнямі.

Індыйскія газэты даюць падрабязныя апісаньні сустрэчы падышаха ў Бамбэі, у якой брала ўдзел каля 500.000 чалавек, начале з прадстаўнікамі розных індускіх і мусульманскіх грамадзкіх і палітычных арганізацый, членамі заканадаўчых сходаў і консульскіх корпусаў.

Віцэ-кароль ня браў удзелу з прычыны хваробы. Вялізарныя натоўпы народу з запалам віталі падышаха.

Пазьней, на афіцыяльным банкеце падышаха віталі губарнатар і прадстаўнікі індускіх і мусульманскіх арганізацый.

Дэлегацыя жыхароў Бамбэю прыпаднесла падышаху адрас, у якім яна скардзіцца на ўдзел з боку ангельскай паліцыі.

16-га сьнежня ў Бамбэі адбыўся грандыёзны мітынг з ўдзелам больш 100.000 індусаў і мусульман. Зьлуленьне падышаха выклікала вялікі энтузіязм і мітынг абярнуўся ў нацыянальную індыйскую маніфэстацыю.

Працэс Беларускай Грамады—20-га лютага.

56 ПАДСУДНЫХ, 420 СЬВЕДАК.

ВІЛЬНЯ, 5. Газэта «Вільнэр Тог» паведамляе, што абвінавачаньня па справе «Грамады» ўжо атрымалі акт абвінавачаньня.

Па першым працэсе прыцягваецца да адказнасьці 56 чалавек, паміж іх дэпутаты Беларускай Грамады—Тарашкевіч, Рак-Міхайлоўскі, Валошын і Мятла, сьвяшчэньнік Коўш, былы дырэктар Віленскай беларускай гімназіі Астроўскі і вядомы беларускі дзеяч Антон Луцкевіч.

Акт абвінавачаньня зьмяшчае ў сабе 360 старонак. З боку абвінавачаньня ў суд выклікаюцца 420 сьведак і 8 экспэртаў.

Паміж сьведак шмат беларускіх грамадзкіх дзеячоў, сярод якіх—былы дэпутат сойму Сабалеўскі, а таксама адвакаты Андрэеў, Чэрніхаў і Радзевіч.

Працэс пачнецца ў Вільні 20 лютага і працягнецца каля двух месяцаў.

Канфіскацыя літоўскае газэты.

ВІЛЬНЯ, 5. Згодна загаду ўрадавага камісара, у Вільні канфіскован апошні нумар літоўскае газэты «Вільніаус Айдас» за перадаваны артыкул пад назвою: «Што далей».

Адказны рэдактар газэты прыцягнут да суду.

Прадстаўнікоў магістрату ня пусьцілі ў Лукішкі.

ВІЛЬНЯ, 5. Віленскі магістрат дэлегаваў прадстаўнікоў у Лукіскую турму, каб зрабіць санітарны агляд харчоў, якія выдаюцца зьняволеным. Турэмная адміністрацыя недапусьціла кантралёраў з магістрату. Апошні зьвярнуўся са скаргаю да пракуратуры.

Адчынілася II сэсія ЦВК БССР.

Учора ў клюбе імя К. Маркса, а 6 гадзіне і 30 хвілін адчынілася 2-я сэсія ЦВК БССР.

Уступнае слова т. Чарвякова.

Сэсію адчыняе старшыня ЦВК БССР т. Чарвякоў. Ва ўступным слове т. Чарвякоў кажа:

— За працяг часу ад 8-га зьезду саветаў да сёньнешняй сэсіі загінуў член ЦВК тав. Апанскі.

Тав. Апанскі аддаў усе свае сілы для справы рэвалюцыі, ён быў яе верным вартаўніком. Ён ішоў туды, куды яго пасылала партыя.

Тав. Апанскі загінуў пры выкананьні сваіх абавязкаў, яго жыцьцё і праца могуць служыць прыкладам для кожнага рэвалюцыянэра. Прапаную ўшанаваць яго памяць уставаньнем. (Усе ўстаюць).

Нядаўна адбылася юбілейная сэсія ЦВК СССР і 15-ы партзьезд, якія падагульнілі вынікі 10-гадовай працы саветаў. Было канстатавана, што першы пэрыяд сацыялістычнага будаўніцтва ўжо прайшоў—адноўлена ўсё тое, што страцілі ў спадчыну саветы. Надзеі нашых ворагаў на тое, што мы ня справімся з гэтай задачай, не апраўдаліся. Мы ня толькі аднавілі разбуранае, але ў шмат якіх галінах нават перасягнулі дарэвалюцыйны ўзровень.

Сэсія ЦВК СССР і 15 партзьезд адзначылі, што мы маем усё, каб перайсьці ў паласу непасрэднага сацыялістычнага будаўніцтва. Галоўная ўвага павінна пры гэтым быць зьвернута на плянавасьць, што дасьць магчымасьць больш пасьпяхова ісьці ўперад па шляху сацыялістычнага будаўніцтва.

Парадак дня сэсіі ў значнай меры прыстасаваны да разгляду плянавых пытаньняў.

Дазвольце выказаць надзею, што праца 2-й сэсіі замацуе тыя посьпехі, якія ўжо мае Савецкая Беларусь і будзе садзейнічаць яе далейшым посьпехам. (Воплескі).

Зацьверджаньне зьмен у складзе ўраду.

Пасьля прамовы т. Чарвякова зьезд зацьвярджае парадак дня і пераходзіць адразу да дзелавой працы. З дакладам аб зьменах у складзе ўраду выступае т. Хацкевіч. Сэсія аднагалосна зацьвярджае зьмены ў складзе ўраду за працяг часу ад 8-га ўсебеларускага зьезду саветаў да 2-ой сэсіі.

* * *

Учора старшыня СНК БССР тав. Галадзед зрабіў даклад аб становішчы і пэрспэктывах разьвіцьця народнае гаспадаркі. Даклад будзе дадзены заўтра.

Хроніка сэсіі.

— Сёньня адбудуцца спрэчкі па дакладу т. Галадзеда.

— Пасяджэньні сэсіі адбудуцца два разы ў дзень: ад 11—3 гадз. дня і ад 6—9 гадзіны ўвечары.

— Устаноўлены наступны рэгламант: для дакладчыка—1 гадз. 30 хвілін, для садакладчыка—40 хвілін, для выступленьня ў спрэчках—у першы раз—10 хвілін, у другі раз—5 хвілін.

— На сэсію маюць прыехаць з Масквы былыя польскія палітвязьні т.т. Альшэўскі і Чарняк.

За скажэньне нацыянальнай палітыкі

ЗЬНЯТ З ПАСАДЫ СТАРШЫНЯ РАЙВЫКАНКОМУ.

ВІЦЕБСК. (Уласн. кар.). Віцебскі акруговы выканком пастанавіў зьняць з пасады старшыню Бешанковіцкага райвыканкому Тадырджу за скажэньне клясавай і нацыянальнай палітыкі ў правядзімай ім савецкай працы.

Акрвыканком пастанавіў таксама аддаць Тадырджу пад суд за шэраг іншых злачынстваў.

Польшча перад выбарамі.

Пілсудзкі рыхтуе „дэкларацыю".

ВАРШАВА. Як паведамляюць, у хуткім часе маршал Пілсудзкі мае намер выступіць з заявою з поваду надыходзячых выбараў. У гэтай заяве будзе зьмешчана праграма ўсіх партый, якія на гэтых выбарах будуць падтрымліваць урадавы лягер.

Пілсудзкі ў сваёй заяве дакранецца пытаньняў аб пашырэньні ўлады прэзыдэнта, зьмены канстытуцыі, адзінасьці ўсіх партый за „мір і парадак" у Польшчы і адзінага фронту ўсіх партый у пытаньнях міжнароднай палітыкі і абароны дзяржавы.

Выбарчы манэўр ППС.

ВАРШАВА, 5. ППС агалосіла свой выбарчы маніфэст, у якім заяўляе, што ППС стала ў апазыцыю да ўраду.

ППС высоўвае наступныя выбарчыя лёзунгі: парляманцкая дэмакратыя, кантроль ураду праз сойм, скасаваньне сэнату, скарачэньне часу службы ў войску і г. д.

У галіне нацыянальнай маніфэст патрабуе аўтаноміі для „крэсаў" (Заходняй Беларусі і Украіны) і для Віленшчыны, свабоды для разьвіцьця культуры нацменшасьцяй.

„Бунд"—з уласным сьпісам.

ВІЛЬНЯ, 6. Утварыўся выбарчы камітэт „Бунду" на Вільні і валодзтве. „Бунд" выступае на выбарах з уласным сьпісам, не далучаючыся ні да якога палітычнага аб'яднаньня. Перамовы з лявіцаю „Паалей-Сіон" ня далі вынікаў.

Беспартыйны камітэт слуг Пілсудзкага.

ВІЛЬНЯ, 6. «Слово» паведамляе, што гэтымі днямі ў Вільні ўтварыўся выбарчы камітэт пад назваю „Беспартыйны камітэт супрацоўніцтва з урадам".

Да гэтага камітэту далучыліся партыя праці, саюз земляробаў уехадных земляў і інш.

Літвіны на выбарах.

ВІЛЬНЯ, 6. Літоўскае жыцьцярства Віленшчыны начало энэргічную падрыхтоўку да выбараў у сойм і сэнат. Гэтымі днямі літоўскі камітэт заказкаў літоўскае жыхарства ўзяць чынны ўдзел у выбарах, намячаючы сьпісы кандыдатаў.

Рэпрэсіі супроць камуністычнага друку ў Францыі.

Чатыры рэдактары прыгавораны да 6 год і 3 мес. турмы.

ПАРЫЖ, 5. За артыкул з поваду хвалявальняў матросаў у Тулоне, рэдактар органу французкае кампартыі „Юманіте"—Фажы прыгавораны да трох месяцаў турмы, другі рэдактар той-жа газэты француа Гэй—да трох гоў турмы. У той-жа дзень той самы склад суду прыгаварыў да аднаго году турмы рэдактара органу французкага камсамолу „Авангард"—Фуркада, рэдактара органу Парыскай раённай арганізацыі кампартыі «Об Сосіаль» Мішэло—па двух справах—да двух год турмы. Усе падсудныя прыгавораны, апрача таго, да грашовых штрафаў.

Барацьба за амністыю ў Баўгарыі.

ВЕНА, 31. Як паведамляюць з Сафіі, у Баўгарыю за апошні час паступіў цэлы рад пратестаў супроць тэрору з патрабаваньнем амністыі палітзьняволеным. Баўгарскі прэм'ер Ляпчаў атрымаў пратэсты ад французскіх адвакатаў, Парыскага камітэту абароны ахвяр белага тэрору па Балканах, французкай сэкцыі МОПР'у і ўсіх муніцыпалітэтаў ваколіц Парыжу.

Наступ бэльгійскіх прадпрыемцаў.

Рабочыя рыхтуюцца да адпору.

ПАРЫЖ, 5. У зьвязку з крызісам у вугальнай прамысловасьці, прадпрыемцы пачалі наступ супроць заработнае платы і іншых заваёў рабочых. У адказ на гэта „федэрацыя рыцараў працы" (бэльгійская рэвалюцыйна - сындыкалісная прафсаюзная арганізацыя) зьвярнулася да ўсіх горнарабочых Бэльгіі з заклікам стварыць адзіны фронт, каб даць адпор прадпрыемцам. Адозва „рыцараў працы" высоўвае шэраг патрабаваньняў, у тым ліку вызначэньне мінімуму зарплаты на падставе сярэднягa даваеннага заработку, скарачэньне працоўнага дня, павышэньне дапамогі на беспрацоўі і г. д.

Прынца Кароля меркавалі прывезьці ў Румынію на самалёце.

АНГОРА, 6. Анаталійскае тэлеграфнае агэнцтва паведамляе.

Паводле вестак газэты „Акшам", што выходзіць у Канстантынопалі, канстантынопальская паліцыя выкрыла загавор, арганізаваны з мэтаю пасадзіць румынскага прынца Кароля на румынскі прастол. Начале загавора стаяць румынскі кавалерыйскі афіцэр Сабры з Дабруджы і палкоўнік Васілеску. Сабры заочна прыгавораны румынскім судом да пакараньня сьмерцю.

Загаворшчыкі нелегальна друкавалі ў Канстантынопалі шматлікія адозвы, якія накіроўваліся ў Румынію. Загаворшчыкі меркавалі прывезьці прынца Кароля ў Румынію на самалёце.

Польшча і Літва.

Віленскі край—ня польская тэрыторыя. Урад Вальдэмараса мае намер абвясьціць Вільню літоўскай сталіцай.

КЭНІГСБЭРГ, 4. «Кэнігсбэргер Гартунгшэ Цэйтунг» зьмяшчае гутарку з літоўскім прэм'ерам Вальдэмарасам. Апошні заявіў, што пастановаю Лігі Нацый ён прымушан пачаць перагаворы з Польшчаю аб тарыфах, сплавах і г. д. па Нёмну. Але адваўленьне гаспадарчых адносін ганлю па дужцы Вальдэмараса, павінна ісьці, не непасрэдна з Віленскага краю, а праз Польшчу і Нямецкі калідор, бо Віленскі край не польская тэрыторыя, а частка Літвы.

Што датычыць паштовых узаемадносін, Вальдэмарас заявачыў, што лісты з Польшчы будуць прымацца літоўскай поштаю толькі тыя, якія будуць паступаць з іншых месц Польшчы, за выключэньнем Віленшчыны. Лісты з Вільні павінны будуць ісьці праз Кэнігсбэрг, або іншым шляхам. Тыя-ж лісты, якія будуць паступаць непасрэдна в Віленшчыны, будуць адсылацца назад, бо, прыняўшы гэтыя лісты, літоўскі ўрад тым самым прызнаў-бы Вільню чужой тэрыторыяй.

* * *

КОЎНА, 4. Літоўскі прэм'ер Вальдэмарас з поваду польска-літоўскага канфлікту, у гутарцы з журналістымі заявіў наступнае:

„Польшча стварыла такое становішча, што пяпер існуюць два калідоры"—паміж Усходняй Прусіяй і Нямеччынай і паміж Літвою і СССР. „Калідор" паміж Літвою і СССР настолькі-ж небясьпечны, як і „калідор" паміж Нямеччынаю і Усходняй Прусіяй, таму Літва павінна і далей імкнуцца атрымаць назад Вільню".

БЕРЛІН, 4. Ковенскі карэспандэнт газэты „Фосішэ Цэйтунг" паведамляе, што тэрмін польска-літоўскіх перагавораў дагэтуль яшчэ ня вызначаны. У літоўскіх палітычных колах лічаць, што перагаворы пачнуцца ўвосень.

—Вальдэмарас,—паведамляе карэспандэнт,—хоча перш дамагчыся зьмены канстытуцыі, унесьці ў яе параграф аб тым, што Вільня лічыцца сталіцаю Літвы, каб гэтым падкрэсьліць, што Літва не адмовіцца ад яе праў на Вільню

Наогул, літоўскія грамадзкія дзеячы вельмі пэсымістычна адносяцца да магчымасьці пачаць у бліжэйшы час літоўска-польскія перагаворы.

* * *

РЫГА, 4, Вестка аб тым, што ў Літву прыяжджае афіцыяльны прадстаўнік Лігі Нацый, зрабіла вялікае ўражаньне ў Коўне. У ковенскіх колах гэта тлумачыцца тым, што Ліга Нацый пастанавіла пасюрыць польска-літоўскія перагаворы.

Посьпех савецкае нафты на сусьветным рынку

псуе нэрвы Детэртынгу.

ЛЁНДАН, 5. Спэцыяльны нумар «Уойль Энд Газ Джорналь» зьмяшчае агляд становішча ў сусьветнай нафтавай прамысловасьці і, між іншым некалькі артыкулаў аб савецкай нафце. У адным з гэтых артыкулаў даецца падрабязны агляд дасягненьняў нафтавае прамысловасьці СССР як у галіне выторчасьці, так і ў галіне разьмеркаваньня. Аўтар артыкулу прадказвае далейшы прагрэс савецкай нафтапрамысловасьці. У заключэньне аўтар артыкулу піша:

«Савецкая нафта набывае ўсё большае значэньне на сусьветным рынку. Непакой арганізацый, якія канкуруюць з савецкай нафтай, зусім зразумелы».

НАЧНОЕ РАДЫЕ.

Заява т. Пахвалінскага.

ШАНХАЙ, 6. Прыехаўшы ў Шанхай, савецкі консул у Кантоне т. Пахвалінскі ўпаўнаважыў карэспандэнта „ТАСС" перадаць шанхайскаму радыё наступную заяву:

„Тэлеграма агэнцтва „Рэйтэр" ад 30-га сьнежня сьцьвярджала, нібы генэральны консул СССР у Кантоне Пахвалінскі заявіў прадстаўніку агэнцтва „Рэйтэр" у Гонконге, што кітайская ўлада Кантону абвінавачала савецкіх служачых асоб за ўдзел у падзеях, якія адбыліся ў Кантоне 11-га сьнежня, і што гэтае абвінавачаньне паслужыла прычынаю пакараньня сьмерцю савецкіх служачых асоб.

Генэральны консул СССР Пахвалінскі адхіляе, што калі-небудзь зрабіў гэткую заяву. Нікому з савецкіх служачых асоб ніколі не прад'яўлялася ніякага абвінавачаньня.. Іх проста ўзялі з консульства і забілі. Ужо пасьля забойства зацікаўленыя ворагі, як відаць, распаўсюдзілі чуткі, нібы савецкія служачыя асобы бралі ўдзел у паўстаньні ў Кантоне. Фактычны бок справы заключаецца ў тым, што на консульства быў зроблены напад вялікім натоўпам кітайскіх салдат; консульства было разрабавана, а асобы, якія жылі ў ім, былі расстраляны салдатамі.

У Кантоне было ўсяго пяць мужчын савецкіх грамадзян, ня лічачы генэральнага консула і ўсе пяцёра былі забіты".

Сёньня т. Пахвалінскі і суправаджаючыя яго асобы выехалі з Шанхаю ў СССР праз Японію.

Малая Антанта занепакоена правозам зброі праз Вэнгрыю.

ВЕНА, 6. Паводле вестак з розных крыніц, Малая Антанта намерана ўзьняць у Лізе Нацый і на канфэрэнцыі паслоў пытаньне аб тайным правозе зброі праз Вэнгрыю ў Польшчу.

У Лізе Нацый пытаньне павінен узьняць румынскі міністр замежных спраў.

Румынскі ўрад перш за ўсё зробіць запытаньне ў Варшаву—ці праўда, што транспарт зброі прызначаўся для Польшчы. Ад адказу Польшчы будуць залежаць далейшыя крокі Румыніі.

По СССР.

Савецкі консул у Ханькоу прыбыў ва Ўладывасток.

УЛАДЫВАСТОК, 6. Сёньня на параходзе „Кагі-Мару" прыбыў з Кобэ ханькоўскі консул тав. Плічэ, сустрэнуты прадстаўнікамі партыйных, савецкіх і прафсаюзных арганізацый.

7-га студзеня экспрэсам выяжджаюць у Маскву пэрсаналы шанхайскага і ханькоўскага консульстваў начале з т.т. Каблёўскім і Плічэ, ганлёвым прадстаўнік у Шанхаі т. Сарокін і сакратар шанкоўскага консульства тав. Барман.

НА 7-ГАДЗІННЫ ПРАЦОЎНЫ ДЗЕНЬ.

МАСКВА, 6. Прэзыдыум ЦК саюзу гарбароў абмеркаваў пытаньне аб пераходзе на 7-гадзінны працоўны дзень вэтуранае прамысловасьці. ЦК лічыць, што ў пачатку 1928-29 гаспадарчага году магчыма ў першую чаргу перавесьці на 7-гадзінны працоўны дзень наступныя буйныя прадпрыемствы: у Ленінградзе—фабрыку і завод «Скараход», завод імя Радзівічава, у Маскве—фабрыку «Буравесьнік» і завод «Чырвоны Пастаўшчык», на Паўночным Каўказе—завод № 2 у Таганрозе, у Кастрамо—Кастрамскую фабрыку абутку, на Украіне—пасадачную фабрыку ў Кіеве, у Вятцы—футраную фабрыку «Белка». Канчатковая пастанова на гэтым пытаньні будзе ўхвалена пасьля яго абмяркаваньня ў камісіі Саўнаркому СССР.

Ю. Стаховіч.

Правакатар Цэхноўскі.

Багінскі, Вечаркевіч—абодвы былыя афіцэры польскае армії. Плюнулі ў твар Рэчы Паспалітай банкіраў і спэкулянтаў,—камуністы сталі:

Трэба в імі расправіцца раз на заўсёды. Даручыць ёсьць каму—Цэхноўскаму. Пан начальнік дэфэнзывы замыншле справу:

Цэхноўскі—вух хлопец. Ніхто не падазрае, нават у партыю пралез...

Арыштаваць Багінскага і Вечаркевіча справа плёвая.

Трэба чысьцей зрабіць: падкінуць бомбу, дынаміт, муму нарабіць.

Можна... Цэхноўскі зробіць.

Трэба сьведку знайсьці.

Можна—Цэхноўскі знойдзе.

Ды яшчэ вось арганізацыю падстроіць.

Можна—Цэхноўскі падстроіць.

І Цэхноўскі апраўдаў сябе, прайшло ўсё гладка: бомбы знайшлі, зьявіліся сьведкі... Багінскага і Вечаркевіча арыштавалі.

Пан старшыня суду вельмі ўцешыўся:

— О-то, о-то справа!

* * *

— Слухай, браток, вазьмі вось гэты пакунак партыйных лістовак. Разумеем, сочаць за мною.

Падумаў, узяў: трэба адрэтаваць.

Пісе дамоў, аглядаецца, глядзіць пільна: знойдуць—пяць год катаргі.

Дома ўздыхнуў вольна. Пакунак схаваў. Поўнач. Стукаюць у дзьверы.

— Адчыні!

— Хто?

— У імя права!

Паліцыя і агенты. Загадваюць, у твар сьмяюцца. Пакунак знайшлі.

На сходах прамуліўшыся да сьценкі чакаў Цэхноўскі.

* * *

Пярэдадне першага мая. Задумаліся Піонткевіч і Цэхноўскі.

— Ну што-ж, прыцелю, лайдачыць будзем?

Цэхноўскі засьміяўся.

— Што вы, што вы, пане Піонткевіч! Ці-ж можна бяз справы сядзець?

Есьць! Па-амэрыканскі. Акурат, як у справе Сако і Ванцеці.

У Варшаве, Кракаве ў працягу тыдню кідаюць бомбы. У кракоўскім універсытэце адна, у варшаўскім—другая. Забіт прафэсар Аржаноцкі, старык несьмяротычны. Даючны зібрал, парадкам дадзеў.

Усё добра, але-ж універсыцкі могуць. Пачнуць падазраваць.

Цэхноўскі ўхмыляецца, з начальнікам дэфэнзывы гутарыць:—Ай, якіж вы, пане Піонткевіч, недагадлівы!

На другі дзень пакінута бомба недалёка ад „Рэчы Паспалітай"—газэты дэфэнзывы і ўраду.

—Ну што-ж, пане Піонткевіч, зараз не дагадаюцца. Чырвоныя падкінулі. Хі-хі-хі... Ха-ха-ха...

Піонткевіч здавосен. Уселіся, чарку выпілі.—Ваша здароўе, пане начальнік. Сто год...—Ваша, пане Цэхноўскі, сто зім...

Атрутнымі газамі.

Бурліць жыцьцё пралетарскае Дамброва. У замысванай вогратцы, з пабітымі мазольнымі рукамі сьпазнаюць ка капальнікі на схо[illegible] прафсаюз, у каапэратыў, у клюб

Вочы [illegible] на вочы насунута.

—Вось Янкоўскі, вось Дамброўскі-Туровіч... Запомнім вас добра, панове-таварышы...

За тры тыдні Камінскі выдаў дэфэнзыве сто чалавек. Зьбілі, у кайданы заковалі, у турму кінулі. У падвале, на гары, у маленькім пакойчыку клакалі дзеткі: баньку, брата забралі...

* * *

Іх імёны Мячыслаў Гайчык і Францішак Пілярчык. Першаму—24 гады, другому—25. Гайчык—капальнік з капальні Рэдэн, Пілярчык—рабочы з гуты.

Доўга сачылі за Камінскім. Сьціскалі кулакі.

—Нашага брата прадае! Юда пракляты!..

Неўпярэдак сталі. Ірыпізьнавалі Камінскага і застрэлілі. Канец правакатару.

Жандары абкружылі дом Гайчыка і Пілярчыка. А яны адстрэльваліся цэлы дзень. Тады выклікалі падмацаваньне. Пачалася аблога. Да апошняга патрона трымаліся заабтыя ў доме.

Рабочыя выглядзелі з суседніх кватэр.

—Малайцы, хлопцы, не даюцца!..

З дому даносіліся палкія гукі „Інтэрнацыяналу".

Проста ня возьмем, падвезлі жандары цішком да дому пошкі апарат. Залажылі ў дом гумавую кішку, пусьцілі газ.

Дом замоўк. Гайчык і Пілярчык задохліся. Два мёртвыя целы выцягнулі зь ногі з дому. Падкованымі абцасаў біхі па галовах трупаў. З мертвых гачой палілася застыглая чырвая кроў...

Пераклад В. Л.

*) Са зборніку „По окраинным трущобам"

Увага гуртку рабкораў пры рэд. „ЗЬВЯЗДА".

У нядзелю, 8-га студзеня, а 5-й гадзіне ўвечары (у памяшканьні рэд. «ЗЬВЯЗДА», Савецкая, 63, 3-і паверх) адбудуцца занятні рабкораўскага гуртку пры рэд. „ЗЬВЯЗДА".

ТЭМА:

Асьвятленьне чарговых кампаній ў насьценгазэтах і пэрыядычным друку.

Просьба зьявіцца без спазьненьня.

Рэдакцыя «Зьвязды».

Чарговая лекцыя ў нядзельным камвузе.

3-га студзеня, а 11 гадз. раніцы, у малой залі клюбу К. Маркса адбудзецца чарговая лекцыя ў нядзельным камуністычным унівэрсытэце на тэму: „Сусьветная гаспадарка і СССР". Лектар тав. Слонім.

Літаратура да лекцыі—мінімум: Даклад тав. Бухарына на 7-м пленуме Камінтэрну. Стэнаграфічная справаздача, 1-ы том, стар. 30—33.

Максымум: М. Сэнтатар—„Да пытаньня аб стабілізацыі капіталізму", стар. 170—184.

„Сацыялістычная гаспадарка" за 1927 г., № 1, артыкул т. Літвінава аб стабілізацыі капіталізму.

Заданьні атрымліваць у агітпрапагандысце. Там-жа маюцца і літаратура.

АПА Менскаруму КП(б)Б.
Праўленьне нядзельнага камвузу.

ЖЫЦЬЦЁ ПАРТЫІ.

Што нам даў кастрычнікавы заклік.

(Новабеліцкая райарганізацыя КП(б)Б. Гомельшчына).

Новабеліцкая партарганізацыя да пачатку кастрычнікавага закліку налічвала ў сваіх радох каля 400 членаў і кандыдатаў партыі. Падача 179 заяў з боку рабочых і работніц аб уступленьні ў партыю сьведчыць перш за ўсё аб тым уздыме настрояў рабочых, які выявіўся ў зьвязку з 10-годзьдзем Кастрычніка і ў зьвязку з тымі труднасьцямі, якія мела партыя ў часе антыленінскіх вылазак трацкісцкай апазыцыі.

Цэнтральны Камітэт партыі ў сваёй пастанове аб шырокім уцягненьні ў партыю рабочых і работніц у дні 10-годзьдзя Кастрычніка-вай рэвалюцыі накіраваў увагу партарганізацыі на прыём у партыю рабочых і работніц, якія бралі актыўны ўдзел у грамадзкай рабоце. Таму задача адбору лепшых рабочых і работніц пры прыёме ў партыю ў парадку кастрычнікавага закліку перад парт'ячэйкамі была асабліва падкрэслена.

Аналіз праходжаньня спраў у ячэйках і далейшы аналіз якасьці новага прыцёку гаворыць аб тым, што парт'ячэйкі ў асноўным з гэтай задачай справіліся. Так, з ліку 179 заяў рабочых і работніц да райкому дайшло 143. Усё гэта сьведчыць аб тым, што парт'ячэйкі ўважліва падыходзілі да прыёму і ставілі перад сабой задачу ўцягнуць у партыю лепшых, найбольш перадавых і актыўных рабочых і работніц.

У выніку ўважлівага разгляду заяў аб прыёме на бюро і пленумах райкому на першае студзеня 1928 году ўсяго прынята 112 чалавек, а частка заяў яшчэ не разгледжана.

Падыходзячы да аналізу якасьнага стану прынятых у партыю, перш за ўсё зьвяртае на сябе увагу іх стаж работы ў прамысловасьці і на транспарце. З ліку прынятых у партыю рабочых і работніц працуюць у прамысловасьці і на транспарце да 5 год—40 чалавек, ад 5 да 10--37 чалавек і 30 чалавек звыш 10 год да 35 год. Гэтыя лічбы гавораць аб тым, што ў партыю ўцягнута рабочае ядро, якое мае салідны стаж работы на вытворчасьці.

Калі ўзяць склад прынятых па тэй рабоце, якую яны выконвалі ў моманту падачы заяў у парадку грамадзкай нагрузкі, то і тут мы маем досыць пацяшаючы малюнак: з ліку 112 прынятых к моманту іх прыёму ў партыю ня мелі грамадзкай нагрузкі ўсяго толькі 20 чалавек, рэштка 92 былі нагружаны пэўнай грамадзкай работай, пры гэтым галоўным чынам мелі выбарныя нагрузкі.

Калі ўзяць паасобна прынятых работніц, дык характэрна, што з ліку 32 прынятых жанчын ня маюць нагрузкі ўсяго толькі 5 чалавек. У ліку прынятых жанчын—11 дэлегатак, рэшта маюць іншую грамадзкую нагрузку.

Характэрна таксама, што з 42 камсамольцаў 23 выконваюць працу па выбарах у камсамоле, гэта значыць, што з ліку прынятых камсамольцаў 50 з лішнім процантаў знаходзяцца на актыўнай камсамольскай рабоце. Потым, як дадатнае зьявішча, трэба адзначыць тое, што з ліку прынятых камсамольцаў ня маюць грамадзкай нагрузкі ўсяго толькі 4 чалавекі.

З 112 прынятых скончылі ці наведвалі школы паліграматы к моманту прыёму 67 чалавек, гэта яшчэ раз сьцвярджае наш вывад аб тым, што ў партыю ўступіла лепшая і актыўнейшая частка рабочых.

Уступленьне ў арганізацыю новага кадру рабочых бязумоўна ўзмоцніць сувязь партарганізацыі з рабочай масай прадпрыемстваў раёну.

Прыём у арганізацыю 112 новых кандыдатаў паставіў перад ёю рад задач па выхаваньні і апрацоўцы новага прыцёку, па ўцягненьні яго ў партыйную работу. Да практычнага вырашэньня гэтых задач арганізацыя прыступіла.

Н. Чэрнін.

Цэнтральнаму Камітэту КП(б)Б.

3-я камсамольская канфэрэнцыя 5-га стралковага корпусу, сабраўшыся для абгаварэньня задачы камсамольскай работы пад кутом узмацненьня баявой моцы Чырвонай арміі, вітае свайго кіраўніка—Кампартыю Беларусі.

Канфэрэнцыя ганарыцца тым, што ў радох нашай арганізацыі няма апазыцыянэраў.

Канфэрэнцыя абяцае яшчэ больш узмацніць работу па камуністычным выхаваньні і баявой падрыхтоўцы ў духу ленінізму.

Камсамольская арганізацыя 5-га корпусу, як і ўсёй Чырвонай арміі, ёсьць і будзе адзінай, згуртаванай, прасякнутай усьведамленьнем важнасьці задач сацыялістычнага будаўніцтва і абароны СССР, якія стаяць перад партыяй, камсамолам і ўсімі працоўнымі СССР і ўсяго сьвету.

Няхай жыве камуністычная партыя—правадыр Чырвонай арміі!

Сьвежая сіла ў партарганізацыі.

(Ляхаўскі раён, Менск).

Рабочыя прадпрыемстваў Ляхаўскага раёну па кастрычнікавым закліку падалі 134 заявы аб уступленьні ў партыю. Райкомам ужо прынята ў кандыдаты партыі 107 чалавек. Сюды не ўваходзяць 62 чалавекі, якія яшчэ не прайшлі праз пленум РК.

Склад прынятых ў партыю па кваліфікацыі і па стажы вытворчай працы вельмі добры. Тых, што працуюць да 3-х год на вытворчасьці—17 чалавек, ад 3 да 5 год—36 чалавек, ад 5 да 10 год—23 чалавекі, ад 10 да 20 год—23 чалавекі і звыш 20 год—8 чалавек.

43 проц. усяго складу кастрычнікавага набору выконваюць розныя абавязкі па грамадзкай працы. 40 чалавек прымала ўдзел у грамадзянскай вайне. Паміж іх 34 проц. камсамольцаў і рабочай моладзі з вытворчасьці. Жанчыны маецца толькі 9,4 проц., але калі прыняць пад увагу, што колькасьць беспартыйных работніц па раёне невялікая, дык і гэтую лічбу трэба прызнаць здавальняючай.

На паасобных прадпрыемствах кастрычнікавы набор выявіўся ў наступным: завод «Мэталь» даў 18 новых ленінцаў, «Чырвоная Зара»—9, сельска-гаспадарчыя майстэрні—11, служба цягі Зах. чыг., МШВ і гарбарня—па 10 чалавек.

Слаба была разгорнута праца па кастрычнікавым закліку ў ячэйках Аўтапрамгандлю і на заводзе «Энэргія».

Райком даручыў усім ячэйкам раёну абгаварыць на бліжэйшых сходах папярэднія вынікі кастрычнікавага набору на сваіх прадпрыемствах, таксама нагрузіць партыйнаю працаю ўсіх новых ленінцаў, маючы на ўвазе, што самай галоўнай іх нагрузкай павінна быць палітычная вучоба.

М. З.

Узьнімаем тэарэтычны ўзровень партыі.

(Кастрычнікаўскі раён. Менск).

Амаль палова навучальнага году ўжо прайшла і мы маем мажлівасьць падвесьці пекаторыя вынікі работы нашай партыйнай школы. Партшкола пачала сваю працу з другой паловы кастрычніка 1927 году. У ёй маецца 6 груп «Б», якія зьяўляюцца добраахвотнаю формаю партыйнай асьветы і маюць праграму нармальнай школы паліграматы, і 5 груп «А», якія зьяўляюцца абавязковай ступеньню партасьветы з праграмаю скарочанай школы паліграматы.

Школа вядзе заняткі два разы ў тыдзень. Для таварышоў, што працуюць на зьменных работах, арганізавана нядзельная школа, якая абслугоўвае гуту і ўсе тэкстыльныя прадпрыемствы. У апошні час арганізавана спэцыяльная група для партыйцаў кастрычнікавага закліку.

За ўсёй школе навучаецца 350 чалавек, з іх партыйная частка складае 54 проц., камсамольская—33 проц. і беспартыйныя—13 проц. Сярэдняе наведваньне школы 75—80 проц. Вялікі процант ненаведваньня школы тлумачыцца тым, што парт'ячэйкі ня выконваюць пастаноў аб тым, што ў дні партыйнай вучобы слухачы школы павінны быць зволены ад усялякай работы. Мы маем рад выпадкаў, калі ў дні заняткаў наладжваюцца пасяджэньні, сходы, праводзіцца масавая работа. Трэба ўзьняць барацьбу супроць такіх зьявішч, выконваць поўнасьцю пастановы акругкому, і наведваньне партшколы бясспрэчна павялічыцца.

Гэтаму яшчэ спрыяе адарванасьць ад школы большай часткі парт'ячэек. А наведваньне апоргаў ячэек надзвычайна неабходна ня толькі для знаёмства з пытаньнем наведваньня. Нашы кіраўнікі групы ў большай часьці студэнты камвузу, незнаёмыя з жыцьцём прадпрыемстваў і практычнаю работаю парт'ячэек на прадпрыемствах. І наведваньне апоргаў будзе скарыстана для зьбліжэньня іх з кіраўнікамі, для азнаямленьня з жыцьцём прадпрыемстваў, што дасьць магчымасьць найлепшым спосабам увязаць тэарэтычную частку праграмы з практыкай работы.

Уся праграма школы была прыстасавана да прапрацоўкі пытаньняў к 15-му партзьезду, і ў заключэньне было пастаўлена спэцыяльнае для ўсіх аднолькавых груп пытаньне аб выніках 15-га партзьезду.

Кіраўнікамі ў асноўным мы забясьпечаны ня дрэннымі. Гэта дае нам пераконанасьць у тым, што партшкола будзе дапамагаць росту тэарэтычнага ўзроўню партыйнай масы, усьведамленьню ленінскага вучэньня, якое зьяўляецца асноўнай гарантыяй для адпору ўсім ухілам і хістаньням унутры партыі.

В. Левін.

Папраўце пакуль ня позна.

(Чырвонаслабодзкая райпартарганізацыя, Бабруйшчына).

Дырэктыва акругкому па ўцягненьні ў партыю сельска-гаспадарчых рабочых і батрацтва была слаба вывучана райкомам, адгэтуль і рад адмоўных момантаў.

У раёне існуюць 4 савецкія гаспадаркі, у якіх працуе каля 100 рабочых, пры чым большая частка рабочых працуе ад пачатку савецкай улады, значная колькасьць іх—былыя чырвонаармейцы, прайшоўшыя добрую школу грамадзкай працы, таму і ўмовы для работы сярод іх спрыяючыя.

Акрамя гэтых рабочых маецца яшчэ 235 батракоў, на якіх заключаны працоўныя дагавары. Пры гэтым пасьцы такіх фактараў здавалася-б, што райком ваўсю разгорне работу на ўцягненьні ў партыю рабочых і батрацтва, але выпла надварот. Раённая арганізацыя за год вырасла толькі на 10 чалавек, пры чым 5 чалавек з іх пераведзена з ЛКСМ.

Вось вынік у справе росту арганізацыі.

А між іншым у арганізацыі па сяньнешні дзень ёсьць усяго 1 рабочы і 4 батракі. Здавалася-б, што такі недахоп партарганізацыі выправіць кастрычнікавым заклікам, але і гэта меркаваньне ня спраўдзілася—кастрычнікавы заклік прашоў міма данай райпартарганізацыі.

«Бачыце, я быў на партыйным зьезьдзе, а таварышы, што засталіся, былі заняты сваёй работай», —гаварыў у апраўданьне сакратар райкому. Зразумела, гэта нікога не пераконвае, ці-ж райком і бюро райкому месьцяцца ў асобе толькі аднаго сакратара? А ці-ж рэшта членаў бюро не нясуць адказнасьці за работу ўсяго райкому?

Не, тут проста грубое ўпушчэньне, як кажуць «прамаргалі» як рост, так і кастрычнікавы заклік.

Зразумела, у гэтых хібах не адставалі і партыйныя ячэйкі. Як правіла, ячэйкі не праводзілі індывідуальнай работы сярод сельска-гаспадарчых рабочых і батрацтва, не вывучалі беспартыйна-бядняцкага актыву, каб потым яго ўцягнуць у партыю, а чакалі, калі ім пададуць заяву, і толькі тады яны рабілі пастанову—ці прыняць, ці адхіліць.

Райкомам, урэшце, ня была ўзята пад увагу важнасьць арганізацыі ў раёне кандыдацкіх груп, бо маючы 4 парт'ячэйкі на 12 сельсаветаў, 14 ячэек КСМ, 4 савецкія гаспадаркі, райкому цяжка было выяўляць партыйнае кіраўніцтва, бо абхапіць «необ'ятное» пры ўсім жаданьні не магчыма. І ў канчатковым выніку атрымлівалася не парткіраўніцтва, а сурагат гэтага кіраўніцтва. Сапраўды, кожная партыйная ячэйка «кіравала» 3 сельсаветамі, 3 ячэйкамі ЛКСМ і плюс іншыя арганізацыі, прычым мястачковая ячэйка так «нагрузілася», што ўжо агульных сходаў для кіраўніцтва было мала, і яна пачала на пасяджэньні бюро ячэйкі ставіць даклады сельсаветаў і ячэек ЛКСМ і іншыя важныя пытаньні.

Усё гэта, магчыма, рабілася з мэтаю, каб усіх «выслухаць» і тым фармальна выканаць свой плян.

У выніку маем: сельска-гаспадарчая крэдытная каапэрацыя—дэфіцытная; партыйнае ядро ў ЛКСМ—малое (2,54 проц.); камісіі пры сельсаветах—у большасьці не працуюць.

Схамянецеся, таварышы чырвонаслабодцы пакуль ня позна; памылкі можна яшчэ паправіць.

Н. Вараб'ёў.

„РЭКС ОРТОДОКСУС“,

або новы кандыдат на патрыаршы прастол.

У віленскім «Slowo», органе красавых зуброў і манархістых, зьявіўся пад новы год цікавейшы артыкул, — вялізарная перадавіца, прысьвечаная беларускаму пытаньню.

Як кожны калядны твор, яна носіць таямнічы загаловак: «Рэкс ортодоксус»—праваслаўны цар. Аднак тут вылажана цэльная філёзофія, грунтоўная палітычная плятформа польскіх паменшчыкаў у Заходняй Беларусі, якія маюць у габінаце Пілсудзкага двух выдатнейшых правадыроў—Мэйштовіча і Незабітоўскага.

Для беларускага савецкага грамадзянства выступленьне «Слово» мае вядомы інтарэс,—для каго чыс та калядны, для каго псыхалёгічны.

Аб чым мова?

Мова ўсё аб тым-жа дражлівым пытаньні,—аб шляхох і выніках удзелу Заходняй Беларусі ў выбарах у польскі сойм. Сярод прыхільнікаў «Слово» таксама як і сярод прыхільнікаў «Кур'ера Віленскага» панує з гэтае прычыны дрэнны настрой.

„Са ўсіх адзнак ясна відаць, што сярод нашых вышэйшых урадоўцаў панує поўнае няведаньне беларускай выбарчай справы. А між тым, набліжаючыяся выбары створаць у нашых адносінах (з беларусамі) пэўны гістарычны паваротъ“.

Так заяўляе «Слово» і робіць спробу аналізаваць магчымыя беларускія «арыентацыі».

*„Беларусы актывістыя *). Ці здабудуць яны галасы? Гэта пытаньне,—асабліва калі прыняць пад увагу, што яны залежны ад кіраўнікоў, якія самі ня ведаюць, чаго хочуць (мілае прызнаньне!). Апрача таго ня ведама, ці патрэбны яны паогул, бо яны разрахоўваюць на тыя галасы, якія пры іх адсутнасьці прыпалі-б польскім сыпіскам“.*

„Беларусы радыкалы, грамадоўцы. Ці можна казаць аб тым, каб яны пазбавіліся варожага стасунку да сучаснай польскай дзяржавы. Ці можна гаварыць у стасунку да іх аб супольным фронце польска-беларускім? Не! Гэта праявы безвыгоднага варожыя да нашае (буржуазнае) дзяржавы, і якіх трэба пішчыць усім, знаходзячымся ў нашым распараджэньні сродкамі“.

Аб тым, ці зьбяруць грамадаўцы галасы,—«Слово» разумна маўчыць. Відаць так сама, як і «вышэйшыя ўрадоўцы» ня мае ў гэтым пытаньні «сталай арыентацыі».

Усё гэта добра, спытаецца кожны, —але пры чым тут «праваслаўны цар»?

А вось слухайце далей.

„Калісьці мы мелі акрэсьленую праграму ў беларускім пытаньні. Польшча праз цэлае XIX стагодзьдзе напампоўвала ўсе крэсавыя (okrainne) народы Расіі, у тым ліку беларусаў, пачуцьцём сваёй народнай асобнасьці, пачуцьцём нацыянальным, каб набыць у іх сабе саюзнікаў у барацьбе з царызмам. Тут варта прыпомніць, што шмат абываталяў нашага краю, у тым ліку прыкладам, пан Раман Скірмунт, былі піянэрамі беларускай нацыянальнай сьвядомасьці“.

Адважна і прыгожа сказана. Ау, пане Скірмунт, піянэр у нацыянальных портках,--дзе вы? Чаму пераставалі «напампоўваць» беларусаў іх «самасьвядомасьцю».

Аказваецца, таму, што сеньня «вымяніліся адносіны».

„Сёньня, пасьля падзеньня царызму, стасункі значна зьмяніліся. Тыя лёзунгі, якія маюць на сабе нешта ад срэбра і амарантаў паўстаньня 1863 г., ужо ня ўплываюць на сьвяленыя народы. Ранейшыя „вольныя з вольнымі“, „агульныя штандары“—прыгожы сёньня на сцэне, або як страсаўскі ўпамін; але як заклік сучаснасьці яны не да ўжытку. Сёньня трэба гаварыць чымсь-ці больш канкрэтным».

Як фігура гавораць паны са «Слова» аб апошнім паўстаньні, у які лёгкі спосаб ставяцца яны да яго амарантовага, тагды рэвалюцыйнага штандару. Ня будзем зварочваць увагі на патомных Домэйкі,—усяроўна іх тлустыя твары, зарытыя ў карыта багатага сыцьця, ня дрогнуць піводным мускулам. Спытаемся лепш, які-ж лёзунг высоўваюць яны сёньня.

Выходзіць, што праваслаўны. Што?—Так, праваслаўны. І пры гэтым не які-небудзь «аўтокефальны беларускі», тыпа блажэннай памяці сэнатара Багдановіча, але запраўдны, старарэжымны маскоўскі.

Калі вылажыць завілую і даўгую (каля 200 радкоў) дыялектыку «Слова» ў кароткім выглядзе, дык аргумэнтацыя яго на гэтую тэму прадставіцца ў наступным выглядзе:

1) „Мы ўвесь час баімося, што Саветы, якія папуюць на беларускай тэрыторыі, заўсёды будуць мець уплыў сярод беларускіх радыкальных партый“

2) У зьвязку з гэтым, „мы ня можам знаходзіць Саветы на грунце нацыянальна-беларускім. Але ня трэба забываціца, што веравызнаньне ёсьць сіла ня меншая, чым нацыяналізм.

3) Дзеля гэтага, паколькі Саветы антырэлігійны, мы пасіны скарыстаць веру,—і справу беларуска-польскіх адносін абаперці не на беларускай нацыянальнай ідэі, а на праваслаўі“.

Калі няма з чаго,—дык з бубнаў: Польшча—ў ролі прадстаўніка праваслаўнага сьвету! Як Англія б'ецца за тытул дзяржавы мусульманскай, так і Польшча—павінна прыняць на сябе тытул дзяржавы праваслаўнай. Да гэтага яе клічуць цені вялікіх праваслаўных мужоў,—Ягайлы, Альгерда, Вітаўта.

„Амбіцыя Польшчы, амбіцыя найвялікшай каталіцкай дзяржавы, амбіцыя дзяржавы Ягайлаў, Алгердаў, Вітаўтаў, павінна выяўляцца не ў аўтакефаліі беларускай царквы, але ў апецы над усёй, супэльнай праваслаўнай царквой“.

Вось куды, у якія гістарычныя верхавіны ўскінула скромная беларуская справа думку сучасных валадыроў Заходняй Беларусі. Вось дзе разгадка таямнічнага «Rex ortodoxus».

Ні многа, ні мала,—панове Цаты, Мацкевічы, Мэйштовічы і К? мараць у Вільні аб «польскім праваслаўным цару». Яны ўглядаюць аканчальнае вырашэньне беларускага пытаньня ня ў уціску беларускай школы, не ў адабраньні сялянскай зямлі, ня ў гвалтах над беларускай культурай—усё гэта па іхнімі нявыстарчальна, а ў каранаваньні полацкага круля праваслаўнай каронай.

Так проста і гавораць:

„Rex ortodoxus!“... Гэты тытул, калі сці караю польскага і нашаму (польска-беларускаму) вялікаму князю. Сёньня ён лёсам гісторыі кінуты зноў у нашыя рукі. Гэта больш, чым беларускі нацыяналізм, якога мы ніколі выкарыстаць ня зможам“.

Пілсудзкі быў-бы недалёкім дзяржаўцам, калі-б не скарыстаў гэткае каштоўнае мысьлі. Можна нават думаць, што ён сам падказаў «Слову» гэтую ідэю,—настолькі яна адказвае ягоным уласным думам аб узнаўленьні вялікага княства літоўскага. Цікава даведацца,—можа ў сьпіску гістарычных рэліквій, што мы павінны зьвярнуць Польшчы, згодна апошняй умове, знаходзяцца «чыста польскія» бармы Манамаха і партрыяршы вянец.

Як-бы там ня было, але каранаваньне Пілсудзкага праваслаўнай каронай дзеля барацьбы з Грамадой,—гэта ўжо не палітычны тупік, не трагэдыя правага польскага грамадзянства,—але калядны фарс. Бязглуздзы, праўда, дзіцячы фарс, але за тое—«с переодеванием».

Дадумацца да яго маглі толькі людзі, якія «народжаны ў няволі» і інакш як па-нявольнаму, па-рабскі думаць ня могуць. Дарма, што яны «белай косьці»: як і ў мінулым, так і цяпер гэтая «белая косьць» ніколі не перашкаджала ім мець чорныя мазгі.

Большага ідэалу і шырэйшай праграмы, чым праграма Філарэтаў, Избеданосцавых і Распуціных,—яны прыняць ня могуць. Пераляканыя барацьбой сучаснага дня і відзьмам свайго няўнікнёнага зьнішчэньня, яны хапаюцца за даўно пахаваныя рэцэпты, спадзяючыся знайсьці ў іх збавеньне сваёй клясы.

Але ўсё роўна,—ня вызваліць іх ад заняпаду і карона Вітаўта. Згніўшыя з сярэдзіны,—яны жыць ня могуць.

Аляксандр Цьвікевіч.

*) Пальнафільская група Міткевіча, зьлёгадоўцаў і рэнтаў

Да сэсіі ЦВК БССР.

Аб сыстэме народнае асьветы ў БССР.

(Гутарка з наркамасьветы т. Баліцкім).

Пытаньне аб сыстэме народнай асьветы асабліва зараз, калі мы сталі на мяжы новай культурнай рэвалюцыі і шырокага разгортваньня ў зьвязку з гэтым масавых культурных асьветных устаноў, набывае асаблівае значэньне. Гэтае пытаньне адначасова зьяўляецца і надзвычайна складаным як з тэарэтычнага, так і з практычнага пункту гляданьня, вось чаму на гэтым пытаньні з самага пачатку рэвалюцыі адбываюцца паміж саюзнымі рэспублікамі самыя гарачыя спрэчкі.

На сэсіі ЦВК БССР пытаньне аб сыстэме народнае асьветы будзе стаяць у парадку папярэдняга абгаварэньня з тым, каб пасьля сэсіі па гэтым пытаньні паладзіць шырокую дыскусію сярод рабочых, сялян, культурна-асьветных і навуковых працаўнікоў, унесьці адпаведныя папраўкі і канчаткова пастаўіць на зацьверджаньне на аднэй з бліжэйшых сэсій.

Тое, што зараз ставіцца пытаньне аб сыстэме асьветы ў заканадаўчых органах, не азначае, што да гэтага часу сыстэмы народнае асьветы ня было. Сыстэма народнае асьветы створана жыцьцём на працягу ўсяго часу савецкага будаўніцтва, справа ідзе аб зацьвярджэньні сыстэмы ў заканадаўчым парадку і аб унясеньні ў зьвязку з гатым у існуючую сыстэму адпаведных зьмен, якія выкліканы жыцьцём і папрамкам разьвіцьця культурнага будаўніцтва.

Сыстэма народнае асьветы, якая будзе абгаворвацца на сэсіі ЦВК, складаецца з 2-х частак: асноўная сыстэма асьветы для дзяцей і моладзі ў парадку паступовага адукацыйнага і выхаваўчага ўплыву і сыстэма асьветы для дарослых і пераросткаў.

Гэтыя дзьве часткі сыстэмы асьветы адначасна зьяўляюцца аднародным цэлым і адна другую дапаўняюць.

Найбольш спрэчным пытаньнем у структурнай пабудове сыстэмы асьветы, як гэта відаць з дыскусіі, якая адбылася да гэтага часу, зьяўляецца—на чым будаваць прафшколы—над сямігодкай ці над чатырохгодкай. Народны камісарыят асьветы лічыць, што ў сваім далейшым разьвіцьці прафшколы павінны будавацца над сямігодкай, але гэта павінна адбывацца паступова, роўналежна з павялічэньнем выпуску дзяцей рабочых і бяднейшых сялян семігадовых школ.

Такім чынам, у бліжэйшыя гады будзе існаваць два тыпы прафшкол: пабудаваныя над чатырохгодкай і пабудаваныя над сямігодкай; лік школ, пабудаваных над сямігодкай, будзе паступова павялічвацца, а лік школ пабудаваным над чатырохгодкай, паступова зьмяншацца.

Другая частка сыстэмы асьветы для дарослых і пераросткаў пакуль што асаблівых прынцыповых спрэчак не выклікае, праўда, дыскусія аб гэтай частцы сыстэмы шырока пакуль што не разгарнулася.

Каля сыстэмы асьветы трэба згуртаваць шырокую грамадзкую думку, бо гэта найбольш грунтоўнае пытаньне з усёй асьветнай палітыкі і практыкі.

М. Г.

Перавыбары ў каапэрацыі.

Крэдыт атрымалі беднякі.

СЛУЦАК. (Ул. кар.). Першыя вынікі перавыбараў сельска-гаспадарчай крэдытнай каапэрацыі па раёне паказваюць узрост актыўнасьці пайшчыкаў пры абгаварэньні справаздач сваіх праўленьняў і асабліва ўзрост актыўнасьці беднаты. Гэтаму спрыялі ў значнай меры праведзеныя сходы беднаты. Беднякі абгаварылі на сваіх сходах пытаньні аб каапэраваньні беднаты, аб скарыстаньні фондаў, аб абслугоўваньні крэдытам. Адзначана, што існуючая сыстэма паручыцельства перашкаджае беднаце атрымліваць патрэбны крэдыт. Перавыбарчыя сходы ў 5-ці сельсаветах, якія абслугоўваюцца Слуцкім крэдытным таварыствам, выявілі, што таварыства цалком абслугоўвала беднату і дапамагала ёй. У Кастрычнікавым сельсавеце заможныя сяляне, нездаволеныя клясавай лініяй таварыства, хацелі сарваць перавыбарчы сход. Хутаране Бакшыцкага сельсавету (заможныя сяляне) заявілі, што яны ня могуць атрымаць належнага крэдыту. Гэтыя факты гавораць толькі на карысьць нашага таварыства. З абраных па пяці сельсаветах 52 упоўнаважаных—36 беднякоў і 16 сераднякоў. Нажаль, сярод абраных толькі 2 жанчыны.

Я.

Расьце лік пайшчыкаў.

СЛУЦАК. (Уласн. кар.) У гэтым годзе спажывецкая каапэрацыя па раёне мае некаторыя дасягненьні. Павялічылася колькасьць пайшчыкаў—зараз іх па раёне 5.371 чалавек, што складае ў адносінах каапэраваньня 35,7 проц. агульнага ліку сялянскіх гаспадарак. Паявыя капіталы павялічыліся па 33 проц. супроць мінулага году. Сярэдні месячны зварот дае павялічэньне па 25 проц.

За кошт праведзенай рацыяналізацыі паменшаны налажэньні, якія ў мінулым годзе складалі 12,7 проц., а ў бягучым—11,4 проц., таксама зьменшаны накладныя выдаткі—у мінулым годзе 4,32 проц., цяпер—2,51 проц.

Каапэравана 59,6 проц. двароў.

МАЗЫР. (Уласн. кар.). Спажывецкая каапэрацыя ў акрузе, ня гледзячы на рад труднасьцяй у працы, значна разгарнулася. Лік пайшчыкаў, у параўнаньні з мінулым годам, павялічыўся на 7.361 чалавек, або на 28,7 проц. Наогул лік пайшчыкаў складае 35.039 чалавек, або 59,6 проц. каапэраваных двароў. Неаслабная праца праводзілася таксама і па лініі каапэраваньня беднаты. За мінулы год спажывецкай каапэрацыяй па Мазыршчыне ахоплена 1.139 беднякоў. Усяго па акрузе каапэравана 3.190 беднякоў, сярэдні пай якіх складае 3 руб. Фонд каапэраваньня скарыстоўваецца на 85 проц.

Паявы капітал нізавой сеткі павялічыўся ў параўнаньні з мінулым годам на 46.161 руб. або на 81,3 проц. У сучасны момант на перавыбарных сходах некаторыя таварыствы пераходзяць на 7-мі, а ў некаторых мясцох на 10-ці рублёвы пай. Значна павялічыліся зваротны нізавое сеткі—больш чым на 22 проц. Да недахопаў у працы трэба аднесьці слаба разгорнутую рацыяналізацыю апарату, рост накладных выдаткаў (на 1,8 проц.), зьмяншэньне аперацый па загатоўках.

Мала жанчын у праўленьнях.

МАЗЫР. Даныя аб ходзе справаздачнай і перавыбарчай кампаніі спажывецкай каапэрацыі гавораць аб вялікім удзеле насельніцтва ў гэтай кампаніі.

Па даных 24 спажывецкіх таварыстваў відаць, што на сходах прысутнічала 58 проц. агульнага ліку пайшчыкаў.

На сходах упоўнаважаных прысутнічала 72 проц. Усяго на сходах упоўнажаных было 486 выступленьняў, што ў сярэднім на адзін сход прыпадае 20 чал.

Пераабраныя праўленьні абнавіліся на 58 проц. Члены і кандыдаты партыі ў складзе членаў і кандыдатаў праўленьняў складаюць 37 проц., камсамольцы--1,4 проц. У складзе рэвізкамісій партыйцы складаюць 20,8 проц.

Як недахоп, трэба адзначыць зусім нязначны лік абраных жанчын у новыя склады праўленьняў (з 72 чалав.—адна) і рэвіз. камісій (з 72 чал. жанчын—2).

Б. Ш.

Слаба ўдзельнічае жанчына.

БАБРУЙСК. (Уласн. кар.) Першыя вынікі перавыбараў кіруючых органаў малочных арцеляй паказваюць значны ўдзел членаў на сходах, а таксама іх актыўнасьць. Беднота, пад кіраўніцтвам мясцовых партыйных ячэек, арганізована выступае з папярэдняй распрацоўкай больш важных пытаньняў на сваіх сходах. На 9 сходах прысутнічала 285 чалавек. У сярэднім удзел на сходах складае 50 проц. На сходах, галоўным чынам у спрэчках, высоўваюцца пытаньні аб узмацненьні завозу канцэнтраваных кармоў, аб арганізацыі злучных пунктаў пры арцелях, а таксама і аб паляпшэньні збыту малочных прадуктаў акрсельсаюзам. Акрамя гэтага вострa ставіцца пытаньне аб павялічэньні паявых капіталаў. Ва ўсіх арцелях пай павялічан да 3 руб. ад каровы, замест 1—2 руб. Каапэраваньне беднаты ўзрасло на 30 проц. за апошні год. Сумы, адпушчаныя для гэтай мэты, арцелямі цалком не скарыстаны.

Неабходна зьвярнуць увагу на скарыстаньне па сваім прызначэньні гэтых фондаў. Зазначаецца малы ўдзел жанчын і вакольнага насельніцтва на сходах.

Яшчэ ня позна. Неабходна зараз-жа праявіць большую ініцыятыву з боку грамадзкіх арганізацый, каб уцягнуць жанчыну-сялянку ў малочную справу, а яна там патрэбна, бо яе ўдзел дапаможа разьвіцьцю і пашырэньню малочнай каапэрацыі.

Ч.

Растратчыкам ня месца ў каапэрацыі.

РАГАЧЭЎ. (Уласн. кар.). Зараз на раёне вядзецца падрыхтоўка да перавыбараў с.-т. каапэратываў і крэдытных таварыстваў. Райкомам КП(б)Б і райвыканкомам даны ўказаньні як парт'ячэйкам, так і сельсаветам аб прыцягненьні ўсёй грамадзкасьці да заслухоўваньня справаздач с.-г. каапэрацыі. Ужо па некаторых сельсаветах праведзены справаздачныя сходы, з 1-га студзеня праводзяцца сходы беднаты. 27-га адбудуцца перавыбары Ціхіцінскага таварыства. З справаздачнага дакладу апошняга відаць, што арганізацыйная праца кульгае. Было праведзена ўсяго 5 сходаў, на якіх прысутнічала 60 проц. пайшчыкаў. Пасяджэньняў праўленьня было за год 31, нарад—7, пасяджэньняў рэвізійных камісій—4. Рэвізія рабілася толькі рэвізійнай камісіяй, адна інструктарам і адна акрфа.

Само праўленьне непрацаздольнае, бо тут сядзяць людзі—былыя растратчыкі, якія і цяпер набіваюць сабе кішэні грамадзкімі грашмі. Ёсьць выпадкі, што пазыка даецца не па прызначэньні, а машыны адпускаюцца ў першую чаргу заможнікам. Наогул, праўленьне не карыстаецца аўтарытэтам, а ў часе рэвізіі прымячаліся недахваты грошай, якія кутка пакрываліся. Трэба ў перавыбарчую кампанію падлічыць гэтыя недахваты і вылажыць іх на сходзе перад усімі пайшчыкамі. Ня трэба таксама дапусьціць у праўленьне сваякоў.

Пайшчык.

Чым зьмяніць маркі.

(У парадку абгаварэньня).

Калі ўводзілася ў ЦРК марачная сыстэма прэміраваньня, калі яна ставілася на абгавор пайшчыкаў, дык прыхільнікі гатае сыстэмы высоўвалі два асноўныя пункты, пацьвярджаючыя карысьць гэтае сыстэмы: 1) марачная сыстэма прэміраваньня прыцягвае пайшчыкаў да пакупак у ЦРК, даючы ім у канцы апэрацыйнага году пэўную суму грошай, 2) стварае матар'яльную зацікаўленасьць у пакупках у ЦРК, гэта сыстэма спрыяе больш шырокаму каапэраваньню мас.

Праціўнікі марачнае сыстэмы высоўвалі яшчэ больш довадаў супроць яе, як непрадукцыйнасьць выдаткаў на маркі, цяжкасьць зьбіраць у працягу году маркі (яны губляюцца), ня ўсе пайшчыкі бяруць маркі, на дробныя сумы—зусім ня бяруць і г. д.

Зараз можна лічыць, што канчаткова перамаглі праціўнікі марачнае сыстэмы і паўстае пытаньне, чым-жа зьмяніць гэту сыстэму, ня страціўшы дадатных яе бакоў. На мой погляд, марачную сыстэму прэміраваньня належыць зьмяніць **выдачаю дывідэнду ў залежнасьці ад паю.** Устанавіўшы такі парадак, што **ўнёсшыя поўны пай атрымліваюць у канцы апэрацыйнага году дывідэнд,** мы ня зьменшым матар'яльнае зацікаўленасьці шырокіх мас у каапэрацыі. Неабходнасьць-жа ўнесьці поўны пай, каб атрымаць дывідэнд, павялічыць прыток паявых узносаў. Што-ж датычыць зацікаўленасьці пайшчыкаў у пакупках у каапэрацыі, дык, здаецца, гэтага каапэрацыі не бракуе — каапэрацыйныя крамы заўсёды поўны пакупшчыкамі, нават вёльмі востра стаіць пытаньне аб зьмяншэньні чарод у каапэрацыі.

Вось, у асноўных рысах, тая сыстэма прэміраваньня, якая можа і павінна замяніць сабою зжыўшую сябе марачную сыстэму. Падрабязнасьці новае сыстэмы патрабуюць распрацоўкі і гэтым павінны заняцца пайшчыкі і сходы ўпоўнаважаных ЦРК.

В. Ляшэвіч.

10 ГОД САЮЗУ ЧЫГУНАЧНІКАЎ НА БЕЛАРУСІ.

Шчырае вітаньне аднаму з буйнейшых атрадаў рабочае клясы БССР.

КП(б)Б упэўнена ў тым, што рабочыя-чыгуначнікі, як і раней, пад кіраўніцтвам камуністычнае партыі будуць ісьці па шляху перамог у сацыялістычным будаўніцтве.

НАШЫ ДАСЯГНЕНЬНІ І ЗАДАЧЫ.

Сутнасьць нашай нацыянальнай палітыкі—гэта поўная ліквідацыя гаспадарчай, палітычнай і культурнай адсталасьці нацыянальнасьцяй. Яна атрымала сваё поўнае разьвязаньне толькі ў кастрычніку 1917 г. і паступова і правільна праводзіцца нашым рабоча сялянскім урадам пад кіраўніцтвам камуністычнае партыі.

Мы маем вялікія дасягненьні ўва ўсіх галінах народнае гаспадаркі і часткова чыгуначнага транспарту: узросшую палітычную актыўнасьць, паляпшэньне матар'яльнага становішча рабочае клясы і г. д.

Усё гэта мы сёньня канстатуем у нас, у Беларусі, ня гледзячы на тое, што ў гады імпэрыялістычнай і грамадзянскай вайны нашаму чыгуначнаму транспарту былі нанесены цяжкія ўдары.

Сьвяткуючы дзесяцігодзьдзе існаваньня нашага саюзу, мы з здавальненьнем адзначаем з усімі працаўнікамі чыгуначнага транспарту СССР, як шчыльнаю яго часткаю, нашы дасягненьні. Гэтыя дасягненьні гавораць за тое, што работа Цэнтральнага Камітэту чыгуначнікаў і ўсіх саюзных арганізацый Беларусі пад кіраўніцтвам камуністычнае партыі была пастаўлена правільна.

У галіне нацыянальнага пытаньня мы бачым, што асноўная маса чыгуначнікаў Беларусіі правільна зразумела сутнасьць правядзеньня беларусізацыі. Мы з здавальненьнем адзначаем, што ўсе чыгуначныя школы пераведзены поўнасьцю на беларускую мову. Апрача гэтага мы маем узросшую актыўнасьць па вывучэньні беларускае мовы нашым прафсаюзным актывам.

На клубным будаўніцтве мы таксама маем вялікія дасягненьні; у нас на БССР маецца 16 чыгуначных клюбаў. Чыгуначныя вузлы зусім забясьпечаны клюбамі, у якіх разгорнута культурная праца па выхаваньні сяброў саюзу.

У рабоце бібліятэк мы таксама маем дасягненьні, як адносна павялічэньня беларускіх кніг і чытаемасьці, а таксама агульнага павялічэньня чытачоў.

Тав. ІВАНОЎ—старшыня беларускага бюро саюзу чыгуначнікаў.

Усё гэта дасьць магчымасьць яшчэ лепш абслугоўваць сяброў саюзу на іх роднай мове.

Асноўная задача ўсіх працаўнікоў чыгуначнікаў Беларусі—і ў далейшым яшчэ актыўней праводзіць беларусізацыю і яшчэ больш забясьпечыць здавальненьне культурных патраўняў сяброў саюзу.

У наступны момант мы маем на абшарах БССР Бюро Цэнтральнага Камітэту чугуначнікаў, навокал якога аб'ядналіся ўсе чыгуначныя прафарганізацыі БССР і гэтым самым яшчэ шчыльней зьвязалі ўсю сваю работу з партыйнымі, прафесыянальнымі, савецкімі і грамадзкімі арганізацыямі.

Наша далейшая задача—яшчэ больш замацаваць гаспадарчую і культурную моц краіны, яшчэ больш забясьпечыць правядзеньне беларусізацыі, шляхам актыўнага ўдзелу ўсіх рабочых у будаўніцтве нацыянальнае культуры і яшчэ больш замацаваць братэрства ўсіх працаўнікоў, усіх нацыянальнасьцяй. **Іваноў.**

Прывітаньне ЦК КП(б)Б.

ЦК КП(б)Б горача вітае адзін з наймацнейшых атрадаў пралетарыяту БССР—саюз чыгуначнікаў у сувязі з яго дзесяцігадовым юбілеем.

У барацьбе за Кастрычнік на Беларусі чыгуначнікі адыгралі вялікую ролю. Яны былі надзейнай апорай камуністычнай партыі на працягу ўсіх дзесяці год. Працоўныя масы БССР асабліва памятаюць гэраічную барацьбу чыгуначнікаў у цяжкія дні грамадзянскай вайны і белапольскай акупацыі на Беларусі.

ЦК КП(б)Б выказвае ўпэўненасьць у тым, што чыгуначнікі і ў далейшым будуць упарта працаваць у справе ўзьняцьця народнай гаспадаркі і транспарту БССР.

Чыгуначнікі Беларусі заўсёды былі і будуць у першых шэрагах пралетарыяту БССР, які ў саюзе з працоўным сялянствам, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, будуе і пабудуе сацыялістычную гаспадарку і камуністычную грамаду.

Хай жыве магутная апора нашай партыі—чырвоны саюз чыгуначнікаў. ЦК КП(б)Б.

Да дзесяцігодзьдзя саюзу чыгуначнікаў.

Дзесяць год існаваньня саюзу чыгуначнікаў неаддзялімы ад дзесяці год Кастрычнікавай рэвалюцыі, дзесяці год дыктатуры пралетарыяту ў СССР. У дні барацьбы пралетарыяту за ўладу, цяжкія дні грамадзянскай вайны, гады аднаўленьня і рэканструкцыі народнае гаспадаркі нашай краіны, чыгуначны пралетарыят быў заўсёды на перадавых пазыцыях. Асноўны нэрв нашае гаспадаркі—транспарт, адноўлены іменна дзякуючы арганізацыйным намаганьням самаахвярнага чыгуначнага пралетарыяту.

Актыўна ўдзельнічаўшы ў разбурэньні старога грамадзянства, прафсаюз чыгуначнікаў у наш час разам з другімі прафсаюзамі на справе ажыцьяўляе вучэньне Леніна, бо ён сапраўды ёсьць школа камунізму, адзін з важнейшых вагароў кіраўніцтва сацыялістычнай прамысловасьці, ёсьць аб'яднаньне масы будаўнікоў новага грамадзянства. М. ГАЛАДЗЕД.

Мацнейшаму атраду прафсаюзнага руху.

Дзесяць год таму назад саюз чыгуначнікаў прадстаўляў з сябе разрозьненыя, пабудаваныя па цэхавым прынцыпе, прафарганізацыі.

У сучасны момант саюз зьяўляецца аднэй з магутных прафарганізацый СССР, якая аб'ядноае ў сваіх радох пагалоўна ўсіх чыгуначнікаў. Перамогшы цэхаўшчыну ў сваіх радох, саюз значна палепшыў матар'яльна-бытавыя і культурныя ўмовы жыцьця сваіх членаў. У той-жа час саюз арганізуе і вядзе масы па шляху актыўнага ўдзелу ў разьвязаньні задач сацыялістычнага будаўніцтва.

Братэрскае прывітаньне саюзу чыгуначнікаў, аднаму з мацнейшых атрадаў прафсаюзнага руху СССР.

Старшыня ЦСПСБ
І. ПЕРАПЕЧКА.

БАРАЦЬБІТАМ ЗА АДНАЎЛЕНЬНЕ ТРАНСПАРТУ.

Шчыра вітаю саюз чыгуначнікаў з 10-годзьдзем. Саюз чыгуначнікаў зьяўляецца аднэй з аноўных сіл пралетарыяту, які бязупынна вядзе барацьбу за палепшаньне транспарту—гэтага нэрву народнае гаспадаркі СССР і актыўна ўдзельнічае ў агульнай справе сацыялістычнага будаўніцтва ў нашай краіне. Мы ўпэўнены, што саюз чыгуначнікаў па рэйках шляху шырока разгорне справу пралетарыяту далёка за межы Саюзу ССР.

Шчыра жадаю далейшага посьпеху ў справе сацыялістычнага будаўніцтва пад кіраўніцтвам кампартыі. Сакратар ЦВК БССР Хацкевіч.

Цягніковыя магілкі адыйшлі ў абсяг мінулага.

Нашы вытворчыя посьпехі.

Тав. БАРУШКА—б. сьлесар, зараз—упоўнаважаны Нар. Кам. Шлях. і Зносін на МБВ чыг.

Праца нашых чыгунак паляпшаецца з кожным годам. Узмацняецца чыгуначная гаспадарка, цягніковыя магілкі адышлі ў абсяг мінулага. Выразным прыкладам дасягненьняў чыгунак можа служыць праца 4-га вучастку службы цягі МБВ чыгункі. Калі ў 1913-м годзе ў месяц не рабілася ніводнага капітальнага і сярэдняга рамонту пасажырскіх вагонаў, то ў мінулым годзе такіх рамонтаў зроблена 7,5 проц.; гадавы агляд пасажырскіх вагонаў у месяц павялічыўся за тры гады ад 1 да 5,8 процантаў; замацоўнічны агляд таварных вагонаў, які ў 1913 годзе складаў 10 адзінак у месяц, цяпер складае 24; у 1913 г. амаль што ня было капітальных рамонтаў таварных вагонаў, цяпер капітальныя рамонты складаюць у месяц лічбу вышэй 40,

Палепшылася і абсталяваньне майстэрань, устаноўлены два паравыя молаты, рэсорная печ, новыя варштаты па апрацоўцы металю і дрэва, праца варштатаў пераведзена на электрычную энэргію, прастой вагонаў у рамонце значна зьменшан—сярэдні рамонт паравозаў замест 25-30 дзён працягваецца 17-18 дзён, капэнцыйны агляд таварных вагонаў замест 9-10 дзён 4-5. Штат вучастку павялічыўся супроць 1913 г. на 17 проц.

Этынгоф.

Тав. ЛЮБІЧ—рабочы-манцёр на працягу 30 год. Зараз—старшыня Вучпрафсожу МБВ чыг.

З гісторыі нашага саюзу на Беларусі.

Зараджэньне саюзу.

У канцы сакавіка 1917 г. пасьля лютаўскай рэвалюцыі на адным з агульных вузлавых сходаў чыгуначнікаў станцыі Менск пастаноўлена аднавіць саюз чыгуначнікаў, існаваўшы ў 1905 г. Але-ж таму, што ніякага статуту там ня было, пастаноўлена было да выпрацоўкі статуту стварыць па службах мясцовыя камітэты і адзін раённы камітэт на выбарчых прынцыпах. Старшынёй першага камітэту службы цягі быў абраны тав. Пікіцін і сакратаром тав. Браздоўка. Пастрой мясцовых камітэтаў у большасьці быў эсэраўскі і меншавіцкі, старшынёй раённага камітэту быў абраны тав. Сьмірноў, палова сяброў гэтага камітэту былі эсэры і палова меншавікі.

Саюз да кастрычнікавага перавароту.

Пад кіраўніцтвам раённага камітэту пачалася падрыхтоўка да кастрычнікавага перавароту. Была зарганізавана чырвоная гвардыя з 46 чалавек. Першы раённы камітэт праіснаваў толькі тры месяцы і распаўся з-за ўнутраных сварак. Пасьля гэтага ён быў рэарганізаваны і пры падтрыманьні шырокіх мас большасьць сацыял-здраднікаў была выкінута, і камітэт быў складзен з бальшавікоў і спачуваючых ім беспартыйных. Гэты раённы камітэт складаўся з 13 членаў. На адным з пасяджэньняў камітэту ў верасьні 1917 г. было пастаноўлена арганізаваць стачачны камітэт. Пад кіраўніцтвам стачачнага камітэту была наладжана забастоўка, разбройвалі белагвардзейскія эшалёны, якія ішлі на дапамогу Карнілаву.

Тав. ЧЫНЕВІЧ — сталяр на працягу 20 год. Зараз—старшыня Учпрафсожу Заходн. чыг.

Кастрычнікавы пераварот.

Пя гледзячы на здраднікоўскую ролю „Віжжаля", рэвалюцыйныя чыгуначныя арганізацыі, атрымаўшы дэнэшу Крыленкі, прынялі меры да недапушчэньня эшалона ў дзіких дывізій на рэвалюцыйны Петраград. Броня-цягніку, які ішоў у Менск на дапамогу стачачнаму камітэту, чыгуначная адміністрацыя перасякала была пуць, але дзякуючы рабочых перашкода была зьнішчана і броня-цягнік прыбыў у Менск, пасьля чаго Менскі „камітэт спасеньня" разьбегся і ўлада была ўзята ў рукі рабочых.

Тав. ГАЛУБКОЎ—гэрой працы, з малых год на вытворчасьці.

Саюз у часе савецкай улады.

Пасьля нямецкай акупацыі і адраджэньня на Беларусі савецкай улады зараз-жа быў арганізаваны на выбарчых пачатках вучасткова-чыгуначны камітэт. У траўні 1919 г. ён быў рэарганізаваны па прынцыпах прафесыйна вытворчага саюзу з аб'яднаньнем усіх камітэтаў у вучкпрафсож пад старшынствам т. Прыялгоўскага. 9-га жніўня 1919 г. Менск заняла палякі. Дзейнасьць прафесыйных арганізацый была перасечана і вучкпрафсож эвакуіраваўся ў Гомель. Пасьля адходу з Менску белапалякаў 11-га ліпеня 1920 г. ізноў быў арганізаваны вучкпрафсож пад старшынствам т. Сокалава. Б—а.

Рабкоры-чыгуначнікі.

Тав. ПАПЛАЎСКІ—рабочы-каваль, вынаходца.

Рэвалюцыя абудзіла ў шырокіх рабочых масах магутную патрэбу праз свой друк дзяліцца сваімі перажываньнямі, горам, радасьцямі, практыкаю і ведамі. Праз друк рабочы прымае ўдзел у сацыялістычным будаўніцтве ўсяе краіны.

Неабходна да 10-годзьдзя саюзу чыгуначнікаў спыніцца на дасягненьнях і росьце рабкораўскай арганізацыі Менскага вузлу Заходніх чыгунак. Толькі ў 1922 г. пры клюбе імя Леніна Заходніх чыгунак арганізавалася насьценгазэта «Рабочы быт», якая аб'яднала вакол сябе невялікую групку рабкораў-чыгуначнікаў. Штат у чым наша насьценгазэта дапамагла будаўніцтву чыгуначнага транспарту, палепшаньню быту нашых рабочых. Пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі саюз, гаспадарнікі і рабкоры дабіліся аднаўленьня транспарту, павялічэньня выпуску вагонаў, паравозаў, зьнішчылі пакражы матар'ялаў.

У 1925 г. насьценгазэта аб'яднала 32 рабкоры. Яна ўжо ня мела магчымасьці абслугоўваць усю чыгуначную вытворчасьць. Пастанавілі наблізіць насьценгазэту да вытворчасьці, выдаваць газэту пры мясцкоме. Замест аднэй газэты пачалі выходзіць чатыры: «Ціскі», «Семафор», «Ваганетка» і «Пяро».

У даны момант гэтыя газэты ахапляюць каля 68 рабкораў. Акрамя таго мы маем вузлавы рабкораўскі гурток у 34 чал.

Н. Крук.

У 1913 годзе—2 школы і 250 вучняў, цяпер—10 школ з 2.000 вучнямі.

Сьвяткуючы 10-ю гадавіну існаваньня саюзу чыгуначнікоў, неабходна ўспомніць аб тым, якую ролю адыгрываў наш союз у справе арганізацыі народнай асьветы на транспарце, у прыватнасьці, на нашым менскім вучастку МБВ.

З першых дзён свайго існаваньня саюз чыгуначнікаў удзяляў шмат увагі справе пашырэньня школьнай сеткі. З 21-га па 23-і год на працягу цэлых двух год саюз чыгуначнікаў кіраваў школамі па ўсёй лініі. Трэба сказаць, што становішча школ у той час было вельмі цяжкое, польская акупацыя пакінула нам зруйнаваныя школьныя будынкі. Трэба было пачынаць справу арганізацыі школ з самага пачатку. Менскаму вучкпрафсожу з сваіх мізэрных сродкаў прыходзілася львіную частку даваць на школьнае будаўніцтва, на абсталяваньне. Былі пабудаваны новыя школьныя памяшканьні ў Менску і Барысаве, адрамантаваны старыя будынкі, набыта клясная мэбля і частка вучэбных прыладаў, так што да моманту перадачы школ у аддзел асьветы пры праўленьні дарогі школы менскага вучастку працавалі ў прыемных умовах. Акрамя таго вучкпрафсож адкрыў дзіцячы сад у Менску на 60 чалавек. І ў сучасны момант, калі школы знаходзяцца ў веданьні праўленьня, саюз, як і раней, матар'яльна падтрымлівае іх. Пры яго дапамозе ў мінулым годзе была пабудована школа на станцыі Фаніпаль.

Калі ў дарэвалюцыйны час у Менскім вучастку існавалі толькі дзьве школы з 250 вучнямі, то цяпер на тым-жа вучастку мы маем 13 школ з 2000 вучняў.

Кузьня кваліфікаваных будаўнікоў.

(Чыгуначная школа вучнёўства).

У 1923 г. пры 4-м вучастку цягі МБВ чыг. па ініцыятыве прафсаюзу адкрылася менская школа вучнёўства на чыгунцы. У тыя цяжкія часы вытворчасьць ня мела магчымасьці адпусьціць хаця-б невялікае абсталяваньне для школы. Ня было і прыстасавнага будынку. Для школы было прадстаўлена старое дэпо. З аддзелу асьветы паступіла 5 сьлясарных ціскоў і два камплекты сталярнага інвэнтару.

Прынята было 60 вучняў і арганізаваны два цэхі: сьлясарны і сталярны.

Шмат працы і энэргіі было патрачана на абсталяваньне школы, на забесьпячэньне яе неабходным інструментам.

У сучасны момант школа мае абсталяваньне, якое каштуе 10.000 руб., і вучэбных прыладаў на суму звыш 1.000. Школа выпусьціла 30 кваліфікаваных сьлесароў і 27 сталяроў; з ліку выпушчаных толькі адзін кінуў сваю спэцыяльнасьць, а рэшта працуюць па тэй спэцыяльнасьці, якую яны вывучалі ў школе. У сучасны момант у школе вучыцца 120 падросткаў, якія разьмяркованы па трох цэхах—сьлясарным, дрэваапрацоўчым і кацёльным. У школе вучыцца 12 жанчын, якія зьбіраюцца стаць кваліфікаванымі чыгуначнікамі. І.

Старонкі мінулага.

(Успаміны старога прафпрацаўніка).

У дзень сьвята 10-годзьдзя існаваньня саюзу чыгуначнікаў мне, як старому члену саюзу, хочацца ўспомніць пройдзены намі этап барацьбы і будаўніцтва. Пасьля перахода ўлады ў рукі рабочых і селян наш урад прыступіў да частковай дэмабілізацыі старое арміі. Пасьля нядалых перагавораў у Берасьці аб міры, сотні тысяч салдат пачалі ўцякаць з фронту ў глыбіню Расіі. Ехалі на дахах вагонаў, буферох, падножках і г. д. Кожнае месца ў цягніку бралася з бою, плянавасьць і правільнасьць работы на транспарце была зьнішчана. Чыгуначнікам прышлося перанесьці лаянкі, зьдзекі, гвалты. Спэцыялістыя чыгуначнікі замест таго, каб дапамагаць нам аднаўляць транспарт, пачалі сабатаваць, падтрымліваць усю контр-рэвалюцыйную вграю, якая імкнулася скінуць уладу саветаў.

Грамадзянская вайна яшчэ больш пагоршыла становішча транспарту. Болагвардзейцы, замежныя імпэрыялістыя, псавалі чыгуначныя шляхі, зьнішчалі паравозы. Зьявіліся славутыя могілкі паравозаў; не хапала апалу. Цягнікі, замест 2—3 дзён, цягнуліся тыднямі. Чыгуначны транспарт дайшоў да небывалага заняпаду.

Толькі пасьля сканчэньня грамадзянскае вайны, рабочая кляса пад кіраўніцтвам камуністычнае партыі прыступіла да адбудовы зруйнаванага транспарту. Трэба сказаць, што ў той час ня было ніводнага прыгоднага таварнага або пасажырскага вагону, аб мяккіх вагонах даўно забыліся. Замест вокан і шыб былі дзюркі або кавалкі фанэры.

За пяць год рабочы-чыгуначнік аднавіў на ўсе 100 проц. свой транспарт і сёньня сьвяткуе свой юбілей, як пераможнік.

Вашчылка

Хроніка сьвяткаваньня.

— Сьвяткаваньне юбілею саюзу чыгуначнікаў на Заходніх чыгунках будзе праведзена па ўсёй лініі з 7-го да 14-га студзеня, а ў Менску 14-га і 15-га.

— На МБВ чыг. па ўсёй лініі будуць правозіцца да 15 студзеня вечары ўспамінаў. Сьвяткаваньне ў Менску адбудзецца 7 і 8-га студзеня.

7-га студзеня склікаецца агульна-вузлавы ўрачысты сход рабочых чыгуначнікаў з дакладам аб 10-годзьдзі саюзу чыгуначнікаў. На гэты сход тэлеграфна запрошаны старэйшыя працаўнікі Менскага вузла.

Пасьля сходу будзе наладжана канцэртнае аддзяленьне і кіно.

— Да сьвята 10-годзьдзя саюзу чыгуначнікаў амаль усе мясцкомы Вучкпрафсожу МБВ чыг. выпусьцілі спэцыяльныя нумары насьценгазэты, прысьвечаныя сьвяту.

— У Менску ў юбілейнай камісіі сканцэнтраваны дыяграмы і плякаты, якія дэманструюць працу чыгуначнікаў за 10 год. Арганізавана выстаўка літаратуры, прысьвечанай юбілею саюзу.

— У Менску Вучкпрафсожам МБВ чыг. адкрыта добра абсталяваная больніца для чыгуначнікаў, р[illegible] 120 стацыянарных месц.

Жанчына-актывістка на чыгунцы.

У Менскім вузле Заходн. чыг. актыўна ўдзельнічаюць у саюзнай рабоце жанчыны-работніцы. Іх 32 чалавекі. Працуюць актыўна як дэлегаткі мясцкомаў, зборшчыкі членскіх узносаў, члены мясцкомаў, вучкпрафсожу і г. д.

Апрача таго займаюць пасады адказных працаўнікоў: старшыня мясцкому № 2—тав. Вялікая, сакратар мясцкому № 4—т. Жыліна.

Такім чынам работніца чыгуначніца да 10-годзьдзя саюзу чыгуначнікаў стала сапраўднай актывісткай і працуе на адказнай саюзнай рабоце.

ПА САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ

ТЭЛЕГРАФУ, ТЭЛЕФОНУ і ПОШТАЙ НАШЫХ КАРЭСПАНДЭНТАЎ

Падрыхтоўка да вясеньняй пасеўнай кампаніі.

(Ад нашага бабруйскага карэспандэнта).

Распачата падрыхтоўчая праца да вясеньняй пасеўнай кампаніі. У сучасны момант спэцыяльнай камісіяй, якая ўтворана акрвыканкомам, распрацован плян загатоўкі насеньня, патрэбнага ў вясеньнюю пасеўную кампанію па нашай акрузе. Колькасьць насеньня, якое мяркуецца загатовіць па пляне, значна павялічана. Павялічэньне, галоўным чынам, падае на тое насеньне, у якім у мінулым годзе адчуваўся недахват з прычыны вялікага попыту. Так, напрыклад, сэрадэлі, якая ў мінулым годзе адсутнічала на рынку, у гэтым годзе мяркуецца загатовіць 3.000 пуд.

Выходзячы з засеўнай плошчы за 1928 г., а таксама заявак райвыканкомаў, мяркуецца загатовіць наступную колькасьць насеньня: капюшыны—16.031 п., цімафэйкі—500 п., вікі—15.000 п., сэрадэлі—3.000 пуд., лубіну—20.000 п., ільну-даўганцу—7.000 пуд., аўсу—100.000 пуд., звычайнага сартовага—20.000 п. і ячменю—5.000 п. Апрача таго мяркуецца загатовіць 900 п. насеньня кармавых буракоў, турнэпсу—330 п. і 44 пуд. морквы.

Частка насеньня будзе загатоўлена на месцы, а большая колькасьць яго будзе завезена з іншых мясцовасьцяй нашага Саюзу.

Загатоўчая праца па набыцьці насеньня вытвараецца акруговым аддзяленьнем Цэнтраземскладу, нізавымі ячэйкамі акрсельсаюзу і і акрсаюзам с.-г. кааперацыі, а таксама і аддзяленьнямі Цэнтраземскладу ў Рагачове і Слуцку. На набыцьцё насеньня акрсельбанкам будзе адпушчан крэдыт. Уся праца праводзіцца з шырокім удзелам агранамаў.

Ч.

Новы завод.

МАГІЛЕЎ. (Уласн кар.). Белдаяржсьпірт адкрывае ў Магілеве завод па вырабе віна з садавіны і ягад. На будаўнічыя работы ўжо адпушчана 150.000 руб. На заводзе будзе працаваць 60 чалавек.

Адкрыцьцё заводу вельмі карысна і своячасова. У горадзе і яго ваколіцах ёсьць шмат сырцу для заводу, які ў ураджайныя гады (асабліва летнія сарты садавіны і ягады) ня мае ні цаны, ні збыту. Адкрыцьцё заводу падштурхне разьвіцьцё садоўніцтва, будзе спрыяць пашырэньню пасеву ягадных кустоў, як парэчак і інш.

Наліччa садавіны і гародніны настолькі вялікае, што мясцовы акрвыканком яшчэ год таму назад запраектаваў пабудову мясцовага садова-гароднічнага і крухмала-патачнага камбінату для вырабу мармаладу, сухога павідла, начынкі для цукерак, для сушкі гародніны. Акрвыканком дамагаецца, каб сродкі для пачатку будаўнічых работ былі адпушчаны сёлета.

Сырцу хопіць для двух заводаў. Лапцэўскі.

Паляпшэньне паступленьня падатку.

Недабор у Межынскім раёне.

(Ад нашага віцебскага карэспандэнта).

Да сканчэньня тэрміну выплаты другое раты с.-г. падатку, 1-га студзеня, па Віцебскай акрузе замест 80 проц. гадавога заданьня сума паступленьня складае 76,26 проц. Плянавае заданьне на 1-ае студзеня выканана на 95 проц.

Характэрна адзначыць, што найбольш слабыя ў эканамічных адносінах раёны—Чашніцкі і Бешанковіцкі—дзякуючы энэргічным мерам, якія былі прыняты ў адносінах да злосных неплацельшчыкаў і бязьдзейнасьці сельсаветаў, аказаліся ўперадзе. Гэтыя раёны выканалі заданьне на ўсе 100 проц. Раёны-ж Ліазьнянскі, Межынскі, Сураскі і Высачанскі, ня гледзячы на спрыяючыя эканамічныя ўмовы ў пэрыяд усёй кампаніі, цягнуцца ў хвасьце.

Недабор падатку ў гэтым годзе асабліва недапушчальны. Так, у мінулым годзе наша акруга мела прыблізна—вызваленых ад падатку ўсяго толькі 26 проц. маламоцных гаспадарак, а сума розных скідак складала толькі 12,3 проц. кантынгэнту ў той час, як у гэтым годзе ільготамі абхоплена да 41 проц. гаспадарак, а сума па ільготах дасягае 22,2 проц. кантынгэнту.

За злоснае ўхіленьне ад выплаты падатку ўжо прыцягнуты да адказнасьці і да штрафаў рад асоб. Але гэтага мала. Тэмп паступленьня падатку дыктуе аб неабходнасьці прыняцьця самых энэргічных мер ня толькі ў адносінах упартых неплацельшчыкаў, але ў адносінах бязьдзейнасьці працаўнікоў,—адказных за пасьпяховае правядзеньне кампаніі. Я.

Становішча горацкага рабочага факультэту.

ГОРКІ. (Уласн. кар.). Уласнай вучэбнай плошчы рабфак ня мае, а карыстаецца толькі тымі памяшканьнямі, якія адпускае яму на кожны сэмэстр акадэмія. Абсталяваньне рабфаку навучальнымі прыладамі толькі пачынае набывацца і наогул рабфак карыстаецца пераважна навуковымі падручнікамі с.-г. акадэміі.

Посьпехі студэнтаў у навучальнай працы вялікія, але не на ўсіх прадметах аднолькавы. [illegible] вялікай [illegible] другога—аб цяжкіх умовах працы.

Лекцыі выкладаюцца на беларускай мове, апарат працуе таксама на беларускай мове, студэнцтва ў прыватным жыцьці пераважна карыстаецца беларускаю.

Культасьветная праца вядзецца слаба. Галоўнай прычынай такой недавальняючай пастаноўкі культасьветнае працы зьяўляецца акадэмічная нагрузка.

З пачатку гэтага навучальнага году акадэмія абсталявала для студэнтаў рабфаку інтэрнат. Усяго размешчана 214 асоб. Л. А.

АДУСЮЛЬ.

— Магілеўскі акруговы зямельны аддзел адшукоўвае месца для пабудовы заводу племяннога сьвіваводзтва (трэці такі завод у Беларусі), на які адпушчаны сродкі з дзяржаўнага бюджэту. (Уласн. кар.).

— З 12-га да 18-га студзеня па раёнах Гомельшчыны скліканюцца раённыя канфэрэнцыі яўрэяў-сялян. Гомельшчына пасылае на ўсебеларускі зьезд яўрэяў-земляробаў 25 дэлегатаў.

— Вядомы мастак Шагал (былы вучань Пэна), прыслаў у Віцебск ліст, у якім паведамляе, што ў Парыжы выдаецца манаграфія аб працах беларускага мастака, жыхара г. Віцебску, Ю. М. Пэна.

— Рост рабочай кааперацыі па Віцебску наглядаецца за апошнія паўтара гады. На першае кастрычніка 1926 г. ЦРК налічвала 11.783 пайшчыкаў, а на 1-е студзеня 1928 г. пайшчыкаў налічваецца 19.100 чалавек.

— На 16-га сьнежня па Гомельшчыне па сельскім абавязковым акладным страхаваньні паступіла 39,8 проц. наліччаных плацяжоў. На першым месцы па выкананьні страхаваньня стаіць Лоеўскі раён. Адстаюць Гомельскі, Чачэрскі, Вяткоўскі, Рэчыцкі і Камарынскі раёны.

— Узмацнілася накіроўваньне беспрацоўных жанчын на працу ў Гомелі. У апошнія дні біржа працы накіравала на прадпрыемствы 50 беспрацоўных жанчын.

— У Бабруйску адбылося першае пасяджэньне таварыства „Аўтадор". Таварыства намячае ў бліжэйшы час завербаваць да 1.000 членаў.

— Па Бабруйшчыне закладзена 975 дасьледчых паказальных вучастка ў па сельскай гаспадарцы. Закладка рабілася галоўным чынам на зямлі зямляўладкаванага насельніцтва.

— Бабруйскі акрсаюз атрымаў 35 вагонаў цукру для вёскі. Гэта дасьць магчымасьць павялічыць здавальненьне вёскі цукрам яшчэ на 40 проц.

Пабудова другой галянтарэйнай фабрыкі ў БССР.

Фабрыку мяркуецца пабудаваць у Воршы.

Учора на пасяджэньні прэзыдыуму ВСНГ быў прынят праект аб пабудове другое галянтарэйнае фабрыкі ў БССР. На фабрыцы будуць выраблящца рэчы, якія дагэтуль пры возіліся з-заграніцы, а іменна: ангельскія шпільки, мэталёвыя гузікі, пражкі, шпількі для [illegible] ў. канцылярскія скрэпкі, чарцёжныя кнопкі і інш.

Па прапанове дырэктара Мэталятрэсту тав. Фіша фабрыка павінна быць пры заводзе «Чырвоны Кастрычнік» у Воршы. На пабудаваньне фабрыкі і абсталяваньне патрабуецца 212.000 руб. Па прыблізных падліках вытворчасьць фабрыкі за адзін год можа даць прыбытку да 500.000 руб. На фабрыцы будзе ўжывацца 7-мігадзінны працоўны дзень.

Прэзыдыум ВСНГ пастанавіў прыступіць да пабудовы фабрыкі ў бягучым будаўнічым сэзоне. Пытаньне аб месцы пабудаваньня перадана ў камісію. Трэба лічыць, што месцам пабудовы будзе завод «Чырвоны Кастрычнік» у Воршы. Фабрыка разьлічана на 50 чал. рабочых.

У прэзыдыуме ЦСПСБ.

(Пасяджэньне 5-га студзеня).

Абсьледваньне тарыфна-нармовачнай работы на прадпрыемствах.

АТЭ ЦСПСБ зроблена выбарачнае абсьледваньне тарыфна - нармовачнай працы на 10 прадпрыемствах—заводах „Пралетары", „Энэргія", „Беларусь", фабрыцы „Вэзуві" і інш.

У большасьці абсьледаваных прадпрыемстваў нармовачная праца слаба пастаўлена.

Адначасны выпадкі заключэньня дагаворў адміністрацыяй некаторых прадпрыемстваў з асобнымі групамі рабочых паміма саюзу і інш.

Прэзыдыум запрапанаваў ЦП саюзаў узмацніць сваё кіраўніцтва нармовачнай працай на саміх прадпрыемствах.

Прызнана няправільным абавязковае папярэдняе зацьверджаньне ўсіх расцэнак у РКК.

Прызнана таксама вусім недапушчальным адвольнае ўстаноўленьне норм расцэнак непасрэдна майстрамі прадпрыемстваў. Саюзы павінны тэрмінова дагаварыцца з гаспадарчымі органамі аб выдзяленьні на тых прадпрыемствах, дзе адсутнічаюць тарыфна-нармовачныя бюро, спэцыяльных працаўнікоў (нармоўшчыкоў).

Рэвалюцыйныя сьвяты і асобныя дні адпачынку.

Прэзыдыум ЦСПСБ згадзіўся з праектам Наркампрацы Беларусі аб устаноўленьні для БССР у працягу году 14 дзён рэвалюцыйных сьвят і асобных дзён адпачынку, пры чым 7 дзён адносяцца да рэвалюцыйных сьвят і 7 дзён, да асобных дзён адпачынку.

Выхад на працу ў іншыя дні прыраўноўваецца да прагулу.

Наркампрацы даручана ўзьняць пытаньне перад Наркампрацы СССР аб устаноўленьні для чыгуначнікаў Беларусі адноўкавых дзён адпачынку з усім насельніцтвам Беларусі.

Пяяское дзяленьне ў Беларусі.

Згодна пастановы Наркампрацы СССР [illegible] адносінах мінімуму зарплаты адносна да [illegible] ад 2-га да 4-га.

Прэзыдыум ЦСПСБ прыняў неабходнім устанавіць па БССР два пояскі: Менск, Віцебск і Гомель—другі пояс, іншыя акругі—трэці пояс.

Наркампрацы даручана сумесна з АТЭ ЦСПС распрацаваць пытаньні аб ужываньні паясного падзелу ў БССР у прыватнасьці ў адносінах былых округ і раёнаў, а таксама пытаньні аб увядзкамі паясного падзелу з нармаванымі стаўкамі па дзяржаўным і мясцовым бюджэтах.

Да канчатковага вырашэньня гэтага пытаньня прызнана неабходным выдаць пастанову аб устанаўленьні дзяржмінімуму на 1927-28 год для Менску, Віцебску і Гомелю, якія адносяцца да другога поясу, у 9 р., для іншых округ па трэцім поясе—8 р.

Крэдытаваньне кас узаемадапамогі.

Белкамбанк выдзяліў некаторую суму на крэдытаваньне кас узаемадапамогі. Прэзыдыум ЦСПСБ гэтую суму рашаў размеркаваць паміж асобнымі округамі Беларусі.

Даручана аргаддзелу ЦСПСБ, віцебскаму і гомельскаму АСПС распрацаваць не пазьней 15-га студзеня праект разьмеркаваньня сум для крэдытаваньня кас паасобным саюзам.

Забесьпячэньне рабочых дэфіцытнымі тавярамі.

Па пытаньні аб парадку забесьпячэньня найшчыкаў рабочай казэнраты дэфіцытнымі тавярамі прэзыдыум ЦСПСБ прыняў наступную пастанову.

Востра-дэфіцытныя тавары адпускаюцца выключна найшчыкам і ў пэўнай норме: адрэз на гарнітур, пальто, на пару майтак і г. д., суконна-ваўняныя тавары разьмяркоўваюцца пэрабкопам паміж асобнымі калектывамі ва ўстаноўленай чарэдзе прапарцыянальна колькасьці найшчыкаў, якія там ёсьць.

Разьмеркаваньне ардэроў па жрэб'ю ні ў якім выпадку не дапушчаецца.

У першую чаргу здавальняюцца дэфіцытнымі тавярамі найшчыкі—члены прафсаюзаў і чырвонаармейцы.

Такім-жа парадкам, як і сукно, разьмяркоўваюцца ўсе іншыя востра-дэфіцытныя тавары, якія адносяцца да першай групы і якія могуць разьмяркоўвацца на калектывах. Усе іншыя тавары, якія адносяцца да другой групы, павінны адпускацца з магазынаў па ўстаноўленым парадку.

Дапамога прафсаюзаў беспрацоўным.

У саюзе друкароў на 15-га лістапада на ўсёй Беларусі налічвалася 525 беспрацоўных. На 1-га ліпеня іх было 465. Павялічэньне ліку беспрацоўных выклікана ліквідацыяй прыватнай картанажнай фабрыкі Лопыпера ў Менску, скарачэньнем штату ў друкарні Палесдруку, ліквідацыяй друкарні Заходніх чыгунак у Гомелі і г. д. Найбольшае беспрацоўе ў Гомельскай акрузе—212, Менскай—197 і Віцебскай—88. Сярод беспрацоўных пераважаюць жаночны—пекваліфікаваныя работніцы—галоўным чынам картанажніцы. Саюз аказвае беспрацоўным пераважна грашовую дапамогу. У сярэднім па Менску атрымліваюць дапамогу 80-90 чалавек. Штомесячная сума дапамогі па Менску дасягае 650 р.

Найбольшая колькасьць беспрацоўных у саюзе мэталістых налічваецца ў Віцебску, Гомелі і Менску. Усяго па Беларусі зарэгістравана да 580 беспрацоўных—членаў саюзу мэталістых.

Асаблівую ўвагу саюз аддае пытаньню арганізацыі працкалектываў. Былы працкалектыў—завод „Усход", які ядначе выш 150 чалавек, пераданы акрыканкому. У гэтым-жа годзе арганізован новы працкалектыў „Усход". З мэтаю павялічэньня кваліфікацыі беспрацоўных, частка з іх накіравана на курсы Ц. І. Працы.

Пры працяглым беспрацоўі—да 2-х год—саюз выдае дапамогу ў працягу 15 месяцаў. Атрымліваючым дапамогу ў страхкасе выдаецца ў саюзе дадаткова ад 4 р. 50 к. да 9 р. у месяц з прыбаўкай на кожнага ўтрыманца на 2 р. Неатрымліваючым у страхкасе дапамогі выдаецца пэнсія ў разьмеры ад 9 руб. да 18 р. з прыбаўкай на кожнага ўтрыманца па 2 рублі. У сярэднім, па Менску атрымліваюць дапамогу 90 чал.

За апошні час у саюзе хэмікаў, у сувязі з пераабсталяваньнем гуты „Кастрычнік" (Бабруйск), лік беспрацоўных некалькі паменшыўся. На гуту былі пасланы 120-130 чалавек. Акрамя таго, 30 беспрацоўных былі накіраваны на гуту «Ільліч» (Магілёўская акруга).

Па Беларусі ў сучасны момант налічваецца каля 500 беспрацоўных.

Узьнята пытаньне аб арганізацыі ў Менску новага працкалектыву хэмікаў.

Па Менску дапамогу атрымлівае каля 100 чалавек, якім выдаецца 700-800 руб. у месяц. Па Беларусі выдаткі на дапамогу беспрацоўным складаюць 2 т. руб. у м-ц.

Пераніс беспрацоўных у саюзе гарбароў законмерны. З агульнага ліку беспрацоўных у 1221 чалавек ад саюзу атрымліваюць дапамогу 249. Сярод беспрацоўных—70 жанчын і 114 падростакаў. Вялікую ролю ў зьмягчэньні беспрацоўя адыгрываюць працкалектывы. У іх па Беларусі занята 984 чал. Саюз правёў рад мерапрыемстваў для пашырэньня і ўзмацненьня існуючых працкалектываў, а таксама забесьпячэньня іх сырдом і поўфабрыкатамі.

Беларускі інстытут гігіены працы.

Дагэтуль часткі беларускага інстытуту гігіены працы былі раскіданы па ўсім горадзе. У апошні час музей працы і псыха-тэхнічную лябараторыю ўдалося сканцентраваць у адным памяшканьні па вул. Карла Маркса.

У сувязі з апошняй пастановай Саўнаркому, інспэкцыя Наркампрацы пачала працу па падшукваньні адпаведнага памяшканьня для інстытуту і разгортваньня яго дзейнасьці.

Псыха-тэхнічная лябараторыя абсталёвана навейшымі апаратамі, атрыманымі нядаўна з-за граніцы. У лябараторыі прамысловай гігіены вядуцца досьледы ўплыву матэрыяльных умоў (вільготнасьць, высокая тэмпэратура і г. д.) на арганізм. Адначасова вядзецца праца па рацыяналізацыі асьвятленьня ў прамысловых прадпрыемствах з пункту погляду гігіены працы. У лябараторыі фізіялёгіі працы робяцца досьледы ўплыву работ розных пяжнасьці на арганізм чалавека. Асноўны мэтад досьледаў—газазьмен. Функцыянуе музей працы.

Папаўненьне музэю новымі карцінамі.

Пры Белмузэі заснавана спэцыяльная камісія, якая мае на мэце прадставіць ў музэй усе лепшыя і больш характэрныя працы мастакоў Беларусі.

Камісія мяркуе набыць для музэю мастацкія карціны з першае і другое ўсебеларускіх мастацкіх выставак. Усяго будзе закуплена да 50 кардін, у тым ліку працы наступных мастакоў: М. Аксэльрода «Пэйзаж», А. Астаповіча «Заклік», «Вечар на вёсцы», «Вятрак» і інш. Я. Ахрэмчыка «Мужчынскі партрэт», А. Грубе (скульптура дрэва) «Лірнік», Дваракоўскага «Аўталітаграфія», А. Касталянскага «Стары», Я. Кругера «Завулак у Менску», В. Кудрэвіча «Раніца», «Над Сьвіслаччу», І. Кураян «Камсамолец», В. Рупая «Партрэт бабкі», «Пэйзаж», Сарокіна «Вецер», А. Тычыны (графіка), чатыры рысункі з цыклю «Беларуская вёска» М. Філіповіча «Дзяўчына», «Дудар», В. Хрусталёва «Беларускі краявід» Цёмкіна «Этюды г. Мазыра», С. Юдовіна з цыклю яўрэйскага мястэчка на Беларусі 7 дрэварытаў.

На гэтую мэту вызначаецца пакі што 3.000 руб.

Абсьледваньне задаваленьня сялянства лесам.

Згодна зацьверджанага ўрадам БССР пляну працы НК РСІ прыступіў да вывучэньня пытаньня аб задаваленьні сялянства драўнінай і аб становішчы лясоў мясцовага значэньня.

Ужо прайшоў досьць значны тэрмін ад часу перадачы сялянству лясоў мясцовага значэньня і паміны былі высьвятліца тыя ці іншыя недахопы ў становішчы гэтага пытаньня, у арганізацыі кіраваньня лясамі, іх забясьпекі, карыстаньня імі.

Адначасова заданьне РСІ абхапляе пытаньне аб задаваленьні сялянства драўнінай наогул як з лясоў мясцовага значэньня, так і з дзяржаўнага лясного фонду, дзе таксама ёсьць недахопы і пажаданьні.

Дакладнае высьвятленьне гэтага пытаньня ў значнай меры залежыць ад таго ўдзелу, які прымуць у гэтай працы мясцовыя савецкія, прафэсыянальныя, партыйныя ўстановы, а асабліва шырокія масы насельніцтва, непасрэдна зацікаўленыя гэтай справай.

Друкарня газэты «Зьвязда»—Менск.

МЕНСК

Дамы-гіганты.

ДАМЫ НА 70 і 120 КВАТЭР.

Да гэтага часу ў Менску адбывалася пробнае кватэрнае будаўніцтва, пры гэтым амаль на 90 проц. драўлянае. Будаваліся дамы 2—5 кватэрныя. Галоўнай прычынай, якая перашкаджала пераходу на буйное каменнае будаўніцтва, зьяўляўся невыстарчальны водпуск крэдытаў, неабходных для пабудаваньня шматпавярховых і шматкватэрных дамоў. Пачынаючы з будучага будаўнічага сэзону будзе зроблены пералом у гэтай галіне.

Камгасам вясною будзе прыступлена да пабудаваньня ў Менску на рагу Унівэрсытэцкай і Камсамольскае вуліц вялікага 4-хпавярховага дому на 70 кватэр. Кубатура дому будзе складаць 17.000 куб. мэтраў.

Згодна пляну кватэры будуць складацца з 2 і 3 пакояў. У кожнай кватэры будзе асобная кухня з невялікай кладовай—сьценнай шафай. Сьценныя шафы будуць таксама ў кожным пакоі.

Атапленьне будзе пабудована цэнтральнае-вадзяное. Пры будынку будуць абсталяваны: спэцыяльная пральня, пакоі для душаў, склады для апалу, вялікі паной для сходаў жыльцоў і г. д.

Ва ўсіх кватэрах, памяшканьнях і калідорах будзе праведзена электрычнае сьвятло. На дварэ будуць пасаджаны расьліны.

Менскім камгасам абвяшчаецца конкурс на праект гэтага дому. Праект павінен быць прадстаўлены ў конкурснае журы не пазьней 20-га лютага г.г. Па конкурсе ўстаноўлены тры прэміі: першая прэмія—700 р., другая—500 руб. і 3-я—350 руб.

Яшчэ больш вялікім зьявіцца дом Белжылсаюзу, які вырашыў у сэзоне гэтага году прыступіць да пабудаваньня шматпавярховага дому на 100-120 кватэр. Для гэтай мэты Белжылсаюз адпушчае 20 проц. кошту ўсяго дому і хадайнічае аб тым, каб рэшту сумы яму даў у якасьці пазыкі Цэнтральны камунальны банк.

Усе пайшчыкі Белжылсаюзу (як адзінкі-асобы, так і ўстановы) вітаюць гэты плян, як меру, барацьбы з кватэрным крызісам.

Прэзыдыум прафсавету даручыў камгасу адшукаць для гэтага дому адпаведны зямельны пляц. Для гэтага дому мяркуецца зямельны вучастак па Нова-Маскоўскай вуліцы наля быв. тэатру „Парыж".

Аздараўленьне Ляхаўкі.

Роўна 4 гады, як жыхары Ляхаўкі скардзяцца на антысанітарныя ўмовы данага раёну. Улетку—смурод і зараза, узімку—вуліцы ўровень з тратуарамі запаўняюцца патокамі сьмярдючае вадкасьці. За апошні час Ляхаўскі раён, з прычыны разводзьдзя, стаў ледзь не бязьлюдным востравам- каб прайсьці вуліцу, неабходна назапасіць спэцыяльныя глыбокія калёшы.

І вось, нарэшце, стогны і енкі жыхароў Ляхаўкі дайшлі да рэдакцыі «Зьвязды». Па прапанове рэдакцыі была створана спэцыяльная камісія з прадстаўнікоў аддзелу аховы здароўя, гарадзкога архітэктара і прадстаўніка «Зьвязды». Уважна былі абсьледваны і вывучаны ўмовы зьліву Камвузу, анатамічкі БДУ і дзіцячае клінікі.

Вынік абсьледваньня наступны: камісія прызнала, што скарыстаньне вулічнага вадасьцёку, прызначанага толькі для дажджавое вады, пад каналізацыйны калектар, ні ў якім разе недапушчальна. Заразная вадкасьць не павінна цячы па вадасьцёках на вуліцы, бо гэта стварае зусім недапушчальныя анты санітарныя ўмовы.

Камісія прапанавала адміністрацыі сталоўкі Камвузу і анатамічкі БДУ скарыстаць выгарбныя ямы, якія ёсьць у іх на дварэ, і арганізаваць пэрыядычную іх ачыстку, вывозячы нячыстоты ў бочках. Апроч таго, камісія пастанавіла пра папаваць праз міліцыю адміністрацыі гэтых устаноў вывезьці лёд з нячыстотамі з вуліцы Лекерта І забруджанай імі, і ў далейшым сачыць за тым, каб вадасьцёкі больш не забруджваліся. Ужытыя меры зьяўляюцца часовымі, а ўвесну будзе наладжана каналізацыя. Е. Г.

Каапэрацыйныя навіны.

4-га студзеня МЦРК атрымаў 1 вагон сьвежай рыбы з Таганрогу. Рыба прадаецца на Нізкім і Віленскім рынках, а таксама ў двух бакалейных магазынах № 50 і 51.

З Цэнтрасаюзу прыбыло 30 скрынак чаю. Чай адпускаецца ўсяму насельніцтву ў выборных кнізках.

У бліжэйшыя дні з Уладывастоку прыбывае 1 вагон ўсурыйскага рысу.

Гэтымі днямі МЦРК атрымлівае 1 вагон салёнага масла з Сібіры, а таксама 1 вагон сьлівачнага масла з Уфы.

Дагавор з Асінстроем.

Беларускае аддзяленьне Электрахімічнага трэсту заключыла дагавор з Асінстроем на дастаўку 38 т. кілёграм медзі. Тэрмін дастаўкі не пазьней сакавіка - красавіка. Гэтая медзь пойдзе для абмоткі навітранай лініі Асінзавода — Выдрыца. Агульная сума зьвыдзе 70 тыс. р., 10 т. кілёграм медзі ўжо адпраўлена Асінстрою.

Адначасова вядуцца перагаворы з Асінстроем па дастаўку высока-вольтавага падземнага кабелю для тарфяных распрадовак. Тэрмін выканаьня заказу--4 месяцы.

Экскурсія рабочай моладзі ў г. Барысаў.

Сёньня менская рабочая моладзь у ліку 40 чалавек выяжджае ў г. Барысаў для азнаямленьня з мясцовымі фабрыкамі і заводамі і з жыцьцём рабочай моладзі г. Барысава.

Барысаўскі раённы камітэт камсамолу наладжвае спатканьне менскай моладзі.

У арганізацыі экскурсіі прыймалі ўдзел ЦВК, акрана і акругком партіі.

За дзень.

— **ЗЬЕЗД ВУЧАСТКОВЫХ ДАКТАРОЎ.** 8-га студзеня ў Менску адкрываецца зьезд вучастковых дактароў.

— **ПОПЫТ НА АБЛІГАЦЫІ ПАЗЫКІ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ.** У сувязі з тыражом пазыкі індустрыялізацыі, які набліжаецца у Менску адзначаецца ўзмоцнены попыт на аблігацыі гэтай пазыкі.

— **ПАДРЫХТОЎКА ДА ПАСЕЎНАЙ КАМПАНІІ.** Народны Камісарыят Земляробства БССР рыхтуецца да вясеньняй пасеўнай кампаніі. Ён зьвярнуўся з хадайніцтвам да Эканамічнай Парады БССР аб водпуску для Беларусі 860 т. р. на загатоўку насеньня.

— **ЗАКУПКА С.-Х. МАШЫН.** Белсельсаюз, у сувязі з вясеньняй пасеўнай кампаніяй, якая набліжаецца, прымае меры да своячасовай загатоўкі с.-г. машын. Белсельсаюз мае завезьці 200 машын па ачыстцы насеньня, 150 сеялак і рад іншых машын і прылад.

— **АД'ЗД ТАВ. ЕРАФЕЕВА ЗА ГРАНІЦУ.** Гэтымі днямі старшыня праўленьня Лесбелу тав. Ерафееў выяжджае ў Данцыг і Нямеччыну для афармленьня раду зьвязлак з заграничнымі фірмамі.

— **БЕЛАРУСКІ ГЭАДЭЗІЧНЫ КАМІТЭТ.** Узьнята пытаньне аб рэарганізацыі асобных двейных ніваліравачных партый у беларускі гэадэзічны камітэт. Дагэтуль ніваліравачныя партыі знак одзіліся пад загадам ВСНГ СССР

— **РАБОЧЫЯ КЛЮБЫ.** У сучасны момант у Беларусі маецца 125 рабочых клюбаў. Найбольш лік клюбаў мае саюз сельскіх і гаспадарчых рабочых—24 клюбы.

— **ЭЛЕКТРЫФІКАЦЫЯ МАСЛАБОЙНАГА ЗАВОДУ.** Новы маслабойны завод Белхартрэсту мяркуецца поўнасьцю электрыфікаваць. Для гэтай мэты купляецца 13 матораў на 300 конскіх сіл.

Здарэньні.

— **Ліквідацыя шайкі злодзеяў.** За апошні час у Менску быў адзначан рад пакраж блізны. Крымінальны вышук затрымаў прафэсыянальных злодзеяў Н. Сачука, І. Якімовіча і М. Дубовіка якія рабілі гэтыя пакражы. Частка пакрадзеных рэчаў знойдзена.

— **На месцы злачынства.** Учочы з 5-га на 6-га студзеня некалькі злачынаў зламалі замкі і дзьверы і ўвайшлі ў памяшканьне падтахнікуму па Камуністычнай, 33, каб пакрасьці розныя рэчы. Аднак яны былі своячасова заўважаны і затрыманы на месцы злачынства. У крымінальным вышуку выявілася, што затрыманыя зьяўляюцца прафэсыянальнымі злодзеямі Наваком, Мацьвеенка і Чыжэўскім. Яны неаднократ судзіліся за пакражы. У злодзеяў адабраны розныя інструманты-адмычкі, ломы і г. д.

СУД.

Хабарніцтва.

Мазырскі інспэктар лясоў гр. Вялікі не асабліва прытрымліваўся інструкцый Нар. Кам. Земляробства БССР наконтаго, каб без дазволу кіраўніцтва лясамі пры Нар. Кам. Земляробства не ствараць зьдзелак з прыватнымі асобамі на продаж ім лясных матар'ялаў.

Гр. Вялікі падпісаў, напрыклад, дагавор з некім Вольфонам, не пагадзіўшы справы з кіраўніцтвам лясамі. З гэтага моманту і пачынаецца гісторыя з хабарніцтвам.

Уласна кажучы, галоўную ролю ў гэтай зьдзелцы адыгрывалі браты Гурэцкія. І вось, калі кіраўніцтва лясамі дагавор не зацьвердзіла, мясцовае начальства ў асобе Вялікага не падумала нават зьдзелку ліквідаваць, а наадварот, загадала сваім падначальным дагавор выканаць.

На месца прыехаў інспэктар кіраўніцтва лясамі Казлоўскі. Абсьледзваўшы справу, ён ужо зьбіраўся паехаць, калі да яго зьвярнуўся адзін з братоў Гурэцкіх і запрапанаваў яму хабар за тое, каб у цэнтры ён не перашкаджаў зацьверджаньню дагавору. Казлоўскі хабару ня ўзяў. Тады „гаспадарчыкі" пачалі рабіць спробы ўсунуць хабар розным іншым асобам з лясных устаноў. Урэшце, усё-ж ніхто хабару ня ўзяў, і справа перайшла ў суд.

Мазырскі акруговы суд, разглядзеўшы справу, знайшоў вінаватым Вялікага і Гурэцкага Шолама і прыгаварыў кожнага з іх да 4 год зьняволеньня, скараціўшы тэрмін зьняволеньня для Вялікага на падставе амністыі напалову.

Вярхоўны суд БССР прыгавор Мазырскага акруговага суду зацьвердзіў.

Радыё-перадача.

7-га—субота. 6 г. 00 х.—6 г. 30 х.—„Чырвоная Зьмена" па радыё. 6 г. 30 х.—7 г. 10 х.—Беларуская радыё-газэта № 5. 7 г. 10 х.—7 г. 40 х.—Гутарка 7-я Асоавіяхіма на тэму: „Адносіны мясцовага насельніцтва да войска". 7 г. 40 х.—8 г. 10 х.—Гутарка ЦК ЛКСМБ на тэму: „Усебеларускае зімовае сьвята фізкультуры". Дакл. Леў. 8 г. 10 х.—10 г.—вечар танцаў.

Апавяшчэньні.

Пленум АК ЛКСМБ.

13-га студзеня, а 2-й гадз. дня, склікаецца пленум Менскага акругкому ЛКСМБ у памяшканьні клюбу КІМ з наступным парадкам дня:

1. Стан актыву і работа з ім; 2. Палажэньне выканаьня дырэктыў аб удзеле ў работе сярод вясковай беднаты і батрацтва; 3. Аб скліканьні акруговай канфэрэнцыі.

Акруговая канфэрэнцыя ЛКСМБ.

14-га студзеня, а 5 гадз. увечары, у клюбе імя К. Маркса адкрываецца 4-я менская акруговая канфэрэнцыя ЛКСМБ. Парадак дня канфэрэнцыі:

1. Вынікі 15-га партзьезду;
2. Даклад ЦК ЛКСМБ;
3. Справаздача акругкому ЛКСМБ і рэвізійнай камісіі;
4. Аб піянэр-рабоце;
5. Даклад „Чырвонай Зьмены";
6. Выбары акругкому, рэвізійнай камісіі, дэлегатаў на ўсебеларускі і ўсесаюзны зьезд ЛКСМ.

Нарада судова-сьледчых і пракурорскіх работнікаў.

НК РСІ і НКЮ Бел. склікаюць у суботу 7-I-1928 г., а 6 гадз. увечары ў памяшканьні залі пасяджэньняў Акр. Суду (будынак НКЮ, 3-ці паверх) нараду судова-сьледчых і пракурорскіх работнікаў і работнікаў органаў дазнаньня, на якім будзе заслухан даклад нам. наркамюсту Бел. т. Еднарала па пытаньні аб спрамчэньні судова-сьледчай і пракурорскай работы.

Запрашаюцца ўсе судова-сьледчыя і пракурорскія работнікі г. Менску, прадстаўнікі НКУС, камісіі прыватных амністый пры прэзыдыуме ЦВК, работнікі органаў дазнаньня і члены калегіі абаронцаў.

Дом працасьветы. Сёньня, 7-I, а 7-й гадзіне ўвечары адбудзецца агульны сход яч. ЛКСМ працасьветы.

Пыусутнасьць усіх камсамольцаў абавязкова.

У Цэнтр. савеце т-ва „Прэч Няпісьменнасьць". У панядзелак, 9-га студзеня, а 6 гадз. увечары, у памяшканьні Наркамасьвет адбудзецца пашырэнае пасяджэньне прэзыдыуму Цэнтральнага савету т-ва «Прэч Няпісьменнасьць».

У парадку дня даклад аб выніках 3 пленуму ЦС ТПН РСФСР.

На пасяджэньне запрашаюцца сябры і кандыдаты ЦС ПН, сябры і кандыдаты Менакрсавету „ПН" і актыў т-ва ПН г. Менску.

Да ведама студэнтаў камвузу.

Даводзіцца да ведама студэнтаў вядзельнага камвузу, што чарговая лекцыя 8 студзеня на тэму „Сусьветная гаспадарка і СССР" адбудзецца не ў малой залі клюбу ім. К. Маркса, а ў вялікай аўдыторыі камвузу (уваход з Унівэрсытэцкай вул.).

АПА Менакрукому КП(б)Б.
Праўленьне вядзельнага камвузу.

Нарада старост папітгурткоў.

У суботу, 7 студзеня, а сёмай гадзіне ўвечары, у цэнтральным габінэце агітпрапаработы (вул. Энгельса) адбудзецца нарада кіраўнікоў і старост палітгурткоў гор. Менску.

Канфэрэнцыя шэфтаварыства.

7-га студзеня, а 6-й гадзіне ўвечары, у памяшканьні клюбу Белкаспасаюзу (Савецкая, 43) адбудзецца канфэрэнцыя райшэфтаварыства Кастрычнікавага раёну.

Папраўкі.

У рэцэнзіі „Аб адным пераканаўшы", зьмешчанай у № 5 газэты „Зьвязда", [illegible] Надрукавана КАІ (50), 12ПзО, трэба чытаць КАІ (50), 12ПзО; надрукавана 43, 60, 190 і 191 стар., трэба чытаць 43, 60, 79, 190 і 191 ст.; надрукавана „серная кислота", трэба чытаць «сернистая кислота»; надрукована прамень, а трэба чытаць крамень.

У „Зьвязьдзе" ад 5-га студзеня, у аддзеле здарэньняў у заметцы «Самагубства» укралася прыкрая недакладнасьць. Гр-ка Макарава замаху на самагубства не зрабіла, а выпіла, як лякарства, вялікую дозу кісляты. Дзяжурным урачом ёй была аказана дапамога.

Адказны рэдактар Я. І. АСЬЧУН.

ТЭАТР. КІНО

Беларускі Другі Дзяржаўны тэатр.	СУБОТА, 7 СТУДЗЕНЯ „КАЛЯ ТЭРАСЫ", драма ў 4-х дзеях 3 часоў 1918 г. Пачатак а 8 з палов. гадзіне
Кіно-тэатр „Культура"	Сучасная драма „ЖЕНА", у 6-ці част. Звыш прагр. Рычард Толмэдж у камэдыі „ЛОВКИЕ ДЕЛЬЦЫ", у 6-ці част.
Кіно „Чырвоная Зорка".	Новая замежная пастаноўка „ГОЛУБАЯ КРОВЬ", маст.-псыхал. драма ў 6 ч. АНОНС! НАСТУПНАЯ ПАСТАНОЎКА „ВЕЧНАЯ БОРЬБА".
Кіно „Пралетары".	„ВАША ЗНАКОМАЯ", сучасная бытавая драма ў 6 часьцях.
Кіно „Інтэрнацыянал".	3-я АПОШНЯЯ СЭРЫЯ 3-я „КЛЕЙМО ПРЕСТУПЛЕНИЯ". Трука-прыключ. кіно-раман у 8 частках.

Высылается не менее 2-х коробок
с ЗЕЛЕНОЙ бандеролью за 2 рубля
с ЖЕЛТОЙ бандеролью за 1 „
При получении полной стоимости (можно марками) за пересылку не платят.
ЗАКАЗЫ, ПИСЬМА и ДЕНЬГИ АДРЕСУЙТЕ:
ТЕХНО-ХИМИЧЕСКИЙ ОТДЕЛ КООПЕРАТИВА
ГАЛЕН-МОСКВА
МОСКВА. УЛ. ГЕРЦЕНА 5. ОТД. 10

ГАСПАДАРЧЫЯ ЎСТАНОВЫ!
Па справах НОВАГА БУДАЎНІЦТВА
— зьвяртайцеся у —
ПРАЕКТНА-ТЭХНІЧНАЕ БЮРО
В. С. Н. Г. Бел.
Тэлефон 10-40. | Менск, Савецкая, 77.

ПРАДАЕЦЦА
ЗРЫЎ-ПАПЕРА, макулатура і старыя газэты
— Цана зьніжана —
Зварочвацца ў галоўную кантору газ. «Зьвязда».
Савецкая, 63, 3-ці паверх.

ОТ НАРОДНОГО КОМИССАРИАТА ФИНАНСОВ Б.С.С.Р.
1-ый ТИРАЖ ВЫИГРЫШЕЙ
ГОСУДАРСТВЕННОГО ВНУТРЕННЕГО ЗАЙМА ИНДУСТРИАЛИЗАЦИИ НАРОДНОГО ХОЗЯЙСТВА СОЮЗА С. С. Р.
будет производиться 14, 15 и 16 января 1928 г. в гор. Москве.
В этом тираже будет розыграно 23.300 ВЫИГРЫШЕЙ
НА СУММУ 3.001.500 рублей,
В ТОМ ЧИСЛЕ:

1 выигрыш	в 25.000 р.	84 выигрыша	по 1.000 руб.
5 выигрышей	по 10.000 „	3.150 выигрышей	по 250 „
10 выигрышей	по 5.000 „	20.050 выигрышей	по 100 „

Выигравшая облигация погашается и не участвует в следующих тиражах. Кроме выигрыша, держателю облигации выплачивается нарицательная стоимость (указанная на облигации) ее, а также проценты, нараслые по текущему купону ко дню тиража.

Выплата выигрышей производится в Москве через 3 дня после выхода газет «Известия СССР и ВЦИК» и «Рабочая Газета», в которых будут опубликованы официальные таблицы выигрышей, а на местах—через 3 дня по получении соответствующего номера указанных газет.

Выплата выигрышей в 100 и 250 руб. и их частей производится всеми финорганами, учреждениями Госбанка и центральными сберкассами наличными деньгами по пред'явлении выигравших облигаций.

Выигрыши в 1.000 руб. и выше, независимо от того, пред'являются ли для получения выигрыша целые облигации или отдельные части их, оплачиваются Правлением Госбанка в Москве. Если выигравший проживает не в Москве, он может поручить получение выигрыша (в 1.000 руб. и выше) финоргану, сберкассе или учреждению Госбанка.

Коллективам учреждений и предприятий надлежит проверить, закреплены ли за всеми подписавшимися членами их коллектива номера облигаций.

В случае каких-либо недоразумений, надлежит обращаться в Валютный Отдел Наркомфина БССР (улица Карла Маркса, 14, телефон 49).

Народный комиссар финансов БССР Микулич.
Заведывающий Валютным Отделом Абрамсон.
449.

ПРОДАЕТСЯ
токарный СТАНОК
САМОТОЧКА МЕТРОВКА.
Менск, Советская, 56, слесарная мастерская. 443

Абчугскі с.-с., Чарэйскага р., Арнаўскай акругі выклікае гр-на Дзярноваа Васіля Марнава на справу аб скасаваньні шлюбу з гр-кай Дзярноваай Лукер'яй Іванаўнай.
У выпадку неяўкі шлюб будзе скасаваны заочна. 450

Кошт публікацыі аб згубе аднаго дакумэнту 50 кап.

Згубленыя і ўкрадзеныя

наступныя дакумэнты лічыць несапраўднымі:

Чырвонаармейца кн. Карнагелева В. І., выд. 2 бел. дывіз. 1229.
Камэрад. мэд. Колесьнікава А. К., выд. МЦРК. 1230.
Кандрат. кн. Гурэвіча Р. Е., выд. МЦРК. 1231.
Сяброўскі білет Віленчыка Н. А., выд. саюзам саўгаспрацаўнікоў. 1232.
Кн. на карм. дзіцяці Карліонава В. І., выд. Менстрахкасай. 1232.
Сяброўск. кн. Даўжыка М. М., выд. саюзам нарсуднікі. 1233.
Лекавая кн. Даўжыка М. М., выд. Менстрахкасай. 1234.
Сяброўская кн. Польдмана С. І., выд. саюзам краўцоў. 1237.
Пасьведчаньне Горштэйн-Лев. Я. І., выд. Полацкім паспэктам. 1238.
Сяброўскі білет калегіі абаронцаў Горштэйн-Лев Я. І. 1239.
Сяброўская кн. Борщ Е. П., выд. саюзам саўгаспрацаўнікоў. 1240.
Конская картка Рольбіна З. Г. 1241.
Аклады ліст Рольбіна З. Г., выд. Заслаўскім с.-с. 1241.
Сяброўская кн. Салавейчыка М. М., выд. саюзам краўцоў. 1242.
Пасьведчаньне Анько А. Я., выд. 6 палком 2 бел. дывіз. 1243.

Прыймо абвестак у чарговы нумар газэты адбываецца да 2-ое гадзіны дня.

Менск, Сакаўлітова № 300